Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 КАСТРЫЧНІКА 2014 г. ПЯТНІЦА № 188 (27798) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## ТБ-праграма ў новым зручным фармаце

СТАР. 5



## «Хітрыкі» і заробкі айчыннага гандлю

СТАР. 15

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Тарас НАДОЛЬНЫ, першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Стаўка рэфінансавання наўрад ці зменіцца да канца года. Вядома, усё будзе залежаць ад узроўню інфляцыі. Яна пакуль ніжэй за стаўку, і мы на сёння не чакаем павышэння. Я думаю, наўрад ці будзе зніжэнне. Акрамя таго, калі не будзе сур'ёзных фінансавых узрушэнняў у краінах, якія з'яўляюцца асноўнымі гандлёвымі партнёрамі, сённяшнія тэмпы змянення валютнага кошыка захаваюцца».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 15° |
| Віцебск | + 12° |
| Гомель | + 13° |
| Гродна | + 14° |
| Магілёў | + 12° |
| Мінск | + 12° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.10.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10610,00 | ▲ |
| Еўра | 13390,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 268,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 819,31 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Восень — работ восем



Фота БЕЛТА.

## АДЗІНСТВА І СТАБІЛЬНАСЦЬ — ЗАЛОГ ДАБРАБЫТУ ГРАМАДСТВА

*Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Рубінава А.М. на адкрыцці шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання*



Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя і журналісты!

Сёння пачынае сваю работу шостая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

Перш чым пачаць разгляд пытанняў парадку дня, хацеў бы падзяліцца ўражаннямі аб сустрэчы кіраўніка дзяржавы з членамі Савета Палаты прадстаўнікоў нашага парламента, праведзенай 29 верасня.

У час гэтай сустрэчы Прэзідэнт даволі падрабязна ахарактарызаваў грамадска-палітычную сітуацыю ў краіне і свеце. Ён падкрэсліў, што на гэтым этапе прыярытэтным напрамкам у развіцці эканомікі краіны з'яўляецца мадэрнізацыя нашых вытворчасцяў, бо без гэтага мы не зможам канкурыраваць на знешніх рынках з іншымі вытворцамі. Кіраўнік дзяржавы заклікаў дэпутатаў вельмі сур'ёзна і ўдумліва паставіцца да фарміравання бюджэту краіны на 2015 год, не дапускаючы тут неапраўданага марнатраўства. Скрупулёзна прааналізаваць пагадненне аб Еўразійскім эканамічным саюзе, якое нам трэба будзе ратыфікаваць. Звярнуў увагу парламентарыяў на тое, што, прымаючы законы, неабходна не толькі адпрацоўваць іх фармулёўкі, але і загадзя аналізаваць, як гэтыя законы будуць прымяняцца і як яны будуць прымацца нашымі грамадзянамі. Падкрэсліў, што законы павінны выкладацца даступнай мовай, зразумелай для шырокага кола людзей. Пры гэтым у заканатворчай дзейнасці неабходна захоўваць разумны баланс паміж стабільнасцю і дынамізмам. Г.зн. не трэба залішне мітусіцца з прыняццем новых законаў, але нельга і запазняцца з заканадаўчым вырашэннем тых пытанняў, якія дыктуюцца жыццём.

Наконт работы дэпутатаў на месцах Прэзідэнт адзначыў, што асноўную ўвагу трэба ўдзяліць дэбюракратызацыі дзейнасці мясцовых органаў улады пры вырашэнні надзённых жыццёвых праблем грамадзян.

СТАР. 2

## У АСНОВУ ЗАКОНА — ПАТРАБАВАННІ ЖЫЦЦЯ

*Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэйчанкі У.П. на адкрыцці пятай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання*



Паважаныя дэпутаты!

Паважаныя члены ўрада, запрошаныя і журналісты!

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь сёння, 2 кастрычніка 2014 года, пачынае работу пятая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

Яна абяцае быць даволі напружанай. У парламенцкім партфелі ўжо каля 60 дакументаў. Многія законапраекты запатрабавалі сур'ёзнай работы з урадам, экспертамі, шырокага грамадскага абмеркавання. Шэраг вострых пытанняў быў разгледжаны на нарадах у кіраўніка дзяржавы.

Ключавой падзеяй для дэпутацкага корпуса стала праведзеная напярэдадні адкрыцця сесіі сустрэча Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з членамі Савета Палаты прадстаўнікоў. У ходзе абмеркавання актуальных праблем жыцця краіны і шляхоў развіцця беларускага парламентарызму кіраўніком дзяржавы былі вызначаны прыярытэты работы Палаты прадстаўнікоў на перспектыву.

Па-першае, гэта заканадаўчае забеспячэнне мадэрнізацыі эканомікі, стымулявання дзелавой актыўнасці, прыцягнення інвестыцый. Самым прамым патрабаваннем да нас, як да заканадаўцаў, з'яўляецца пошук здаровага балансу паміж стабільнасцю закона і дынамізмам жыцця. Пры гэтым кожны прававы акт павінен быць зразумелым і даступным не толькі спецыялісту, але і звычайнаму чалавеку.

Гэтыя арыенціры пакладзены ў аснову планаў на бягучую сесію. У заканадаўчым аспекце важнейшай задачай для нас з'яўляецца работа над пакетам бюджэтных дакументаў. Апіраючыся на набыты вопыт, дэпутаты актыўна ўключыліся ў падрыхтоўку праекта Закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2015 год». Галоўны акцэнт зроблены на аптымізацыі бюджэтных расходаў. Нягледзячы на няпростыя знешнеэканамічныя ўмовы, мы павінны выйсці на бюджэт, які забяспечвае стабільнае развіццё эканомікі, рэалізацыю планаў яе тэхнічнага пераўзбраення і безумоўнае выкананне сацыяльных абавязацельстваў дзяржавы.

СТАР. 3

# АДЗІНСТВА І СТАБІЛЬНАСЦЬ — ЗАЛОГ ДАБРАБЫТУ ГРАМАДСТВА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Вядома, вы і без мяне ведаеце аб выніках сустрэчы Прэзідэнта з дэпутатамі са сродкаў масавай інфармацыі. Але я вырашыў, што трэба асабліва акцэнтаваць вашу ўвагу на парадах і пажаданнях кіраўніка дзяржавы, дадзеных ім дэпутатам, паколькі яны ў поўнай меры адносяцца і да нас, членаў Савета Рэспублікі.

Паважаныя калегі!

Вы ведаеце, што развіццё нашай краіны на цяперашнім этапе праходзіць у вельмі складанай міжнароднай абстаноўцы. У свеце сёння вельмі неспакойна.

Мы з болем і трывогай прадўжаем сачыць за падзеямі ва Украіне, дзе была развязана братазабойчая вайна. Кіраўнік нашай дзяржавы заняў выключна мудрую і гуманную пазіцыю ў гэтым пытанні, якую мы поўнасцю падтрымліваем. Менавіта дзякуючы яго намаганням удалося дабіцца пэўнага пералому ў гэтай трагічнай сітуацыі. Як вы ведаеце, у Мінску быў падпісаны пратакол аб спыненні агню на паўднёвым усходзе Украіны. Нягледзячы на перастрэлкі проціборствуючых бакоў, якія прадаўжаюцца, з'явілася надзея на ўстанаўленне трывалага міру ў гэтым рэгіёне. Хоць мы разумеем, што палітычная сітуацыя ва Украіне яшчэ далёкая ад свайго вырашэння і трэба будзе яшчэ шмат зрабіць, каб мірны працэс стаў неабарачальным.

Прычыны канфлікту ва Украіне неаднаразова называліся. Гэта карупцыя, развал улады і, вядома, нацыянальная і рэлігійная нецярпімасць. Таму кожны з нас у сваёй рабоце павінен улічваць гэтыя пагрозы, каб такія разбуральныя з'явы не знайшлі б глебы ў нашай дзяржаве.

Рэспубліка Беларусь паслядоўна праводзіць міралюбівую палітыку і выступае за канструктыўны і раўнапраўны дыялог з усімі дзяржавамі. Гісторыя вучыць, што палітыка пагроз, шантажу і ўльтыматумаў адносна любой краіны ніколі не дае вынікаў і з'яўляецца бесперспектыўнай.

Разам з тым хачу адзначыць, што апошнім часам намеціліся пазітыўныя зрухі ў нашых адносінах з заходнімі краінамі, ва ўсякім выпадку, аднавіўся дыялог па шэрагу пытанняў, якія ўяўляюць узаемны інтарэс. Яркім пацвярджэннем гэтага з'яўляецца праведзены ў Нью-Ёрку першы Беларуска-амерыканскі інвестыцыйны форум, у рабоце якога прыняла ўдзел прадстаўнічая дэлегацыя нашай краіны на чале з прэм'ер-міністрам М.У. Мясніковічам.

У той жа час мы бачым, наколькі сур'ёзна ў апошнія месяцы абвастрыліся адносіны паміж Расіяй, з аднаго боку, і ЗША і асобнымі еўрапейскімі краінамі — з іншага. Серыя эканамічных і палітычных санкцый, уведзеных адносна Расіі з боку ЗША і Еўрасаюза, непазбежна правакуе меры ў адказ. А вайна санкцый — гэта, па сутнасці, новая форма халоднай вайны. Але з вопыту другой паловы дваццатага стагоддзя мы ведаем, што халодная вайна не ідзе на карысць ні аднаму з бакоў, што процістаяць адзін аднаму. Таму застаецца спадзявацца, што Захад усведаміць бесперспектыўнасць і нават згубнасць курсу на канфрантацыю і ўзнікшая канфліктная сітуацыя рана ці позна паспяхова вырашыцца.

Але ў любым выпадку Расія — наш саюзнік. І мы гатовы выконваць усе свае саюзныя абавязацельствы, у тым ліку і па прадухіленні транзіту заходніх грузаў, забароненых для ўвозу на расійскую тэрыторыю. Але, вядома, пры гэтым мы не павінны дапусціць і якога-небудзь урону сваім нацыянальным інтарэсам.

Сёння для нас самае галоўнае — гэта захаванне стабільнасці ў грамадстве. А для гэтага неабходна, каб нармальна працавала эканоміка, каб людзі былі заняты справай, своечасова і ў поўным аб'ёме атрымлівалі зарплаты. Каб не было безгаспадарчасці на вытворчасцях, на належным узроўні падтрымлівалася выканальніцкая дысцыпліна ў працоўных калектывах. Тады і людзі будуць задаволены, і ў неабходных аб'ёмах будуць выплачвацца пенсіі, дапамогі і стыпендыі.

Хачу адзначыць, што пры ўсёй няпростай сітуацыі ў свеце наша грамадства кансалідаванае, краіна ўпэўнена і паступальна рухаецца наперад. Мы дастойна адзначылі 70-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У гэтым годзе сабраны рэкордны ўраджай збожжавых. Галоўнае — не спыняцца, не страчваць тэмпу і з максімальным эфектам рэалізаваць эканамічны патэнцыял краіны для пашырэння міжнароднага супрацоўніцтва і прасоўвання нашых тавараў на сусветны рынак. Трэба таксама ў поўным аб'ёме выкарыстоўваць новыя магчымасці, якія адкрываюцца ў нас як у двухбаковых адносінах з Расіяй, так і ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза.



**У кулуарах сесіі Савета Рэспублікі.**

Фота БЕЛТА.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Вы ведаеце, што па даручэнні кіраўніка дзяржавы ў нашай краіне ідзе грамадскае абмеркаванне праекта закона «Аб барацьбе з карупцыяй». Члены Савета Рэспублікі таксама ўключыліся ў гэты працэс. Мы разгледзелі гэта пытанне на пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі. Больш як у 20 друкаваных сродках масавай інфармацыі апублікаваны артыкулы і інтэрв'ю нашых парламентарыяў. У сваіх выступленнях яны акцэнтавалі ўвагу на навацыях, якія прапануецца ўнесці ў законапраект, на неабходнасці ўзмацнення работы па прафілактыцы карупцыйных правапарушэнняў, на ўдасканаленні працэдуры і механізмаў выяўлення злачынстваў, фарміраванні актыўнай пазіцыі грамадства па выкараненні гэтых негатыўных з'яў.

Усе прапановы членаў Савета Рэспублікі па гэтым законапраекце абагульнены і накіраваны ў Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь.

У цэлым у міжсесійны перыяд работа парламентарыяў была сканцэнтравана на вырашэнні актуальных задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Праводзілася планавая работа над законапраектамі аб рынку каштоўных папер, гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў фізічных асоб, прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці і пераўтварэнні дзяржаўных унітарных прадпрыемстваў у адкрытыя акцыянерныя таварыствы, аб чыгуначным транспарце, а таксама па пытаннях абарачэння лекавых сродкаў, донарства крыві і іншымі.

Члены Савета Рэспублікі сумесна з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў і экспертамі правялі маніторынг практыкі прымянення асобных законаў. У фармаце круглых сталоў і семінараў былі разгледжаны пытанні прававога рэгулявання адносін, якія ўзнікаюць пры ажыццяўленні інвестыцый, адвакацкай дзейнасці, процідзеяння гандлю людзьмі, пры правядзенні экалагічнага аўдыту, прымяненні Кодэкса аб адукацыі.

Выпрацаваныя ў ходзе маніторынгу прапановы будуць улічаны пры ўдасканаленні нацыянальнага заканадаўства.

Разгледжаны праекты мадэльных заканадаўчых актаў у сферы аўдытарскай дзейнасці, мясцовага самакіравання і арганізацыі мясцовых фінансаў. Асобныя заўвагі і прапановы былі накіраваны ў Міжпарламенцкую асамблею СНД.

У міжсесійны перыяд працаваў Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі. У прыватнасці, мы правялі выязное пасяджэнне ў Салігорскім раёне. Члены Савета азнаёміліся з лепшымі прыкладамі работы мясцовых органаў улады па навядзенні парадку на зямлі і добраўпарадкаванні населеных пунктаў. Быў прыняты шэраг рашэнняў, накіраваных на ўдасканаленне дзейнасці мясцовых органаў улады і ў цэлым на паляпшэнні ўмоў жыцця насельніцтва раёна. Некаторыя пытанні, узнятыя на пасяджэнні, маюць агульнарэспубліканскі характар і патрабуюць вырашэння з боку цэнтральных органаў кіравання. Гэта датычыцца ўдасканалення праекта закона «Аб пахаванні і пахавальнай справе», а таксама пытання аб устанаўленні адказнасці прыватных домаўладальнікаў за санітарнае ўтрыманне тэрыторый, прылеглых да іх домаўладанняў. Па выніках наведвання салігорскай птушкафабрыкі было ўзнята пытанне аб неабходнасці правядзення спецыяльных даследаванняў па барацьбе з эпідэміямі свойскай птушкі. Па нашай просьбе НАН Беларусі пачала ўжо работу ў гэтым напрамку.

Павінен адзначыць, што прапановы Савета па ўзаемадзеянні, якія мы накіроўваем у рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, уважліва разглядаюцца і, як правіла, улічваюцца пры падрыхтоўцы адпаведных рашэнняў, у тым ліку на заканадаўчым узроўні.

Наступнае пасяджэнне нашага Савета мы плануем правесці ў Гродзенскай вобласці. На ім прадугледжваецца разгледзець пытанне аб рабоце мясцовых органаў улады па рэалізацыі ўказа Прэзідэнта, які датычыцца прыцягнення дадатковых даходаў у мясцовыя бюджэты. Раней намі было прыкладзена нямала намаганняў для таго, каб у гэты ўказ былі ўнесены адпаведныя папраўкі. Цяпер трэба паглядзець, як мясцовыя ўлады выкарыстоўваюць прадастаўленыя ім новыя магчымасці для папаўнення сваіх фінансавых сродкаў.

У мінулы перыяд члены Савета Рэспублікі актыўна ўзаемадзейнічалі з выканаўчай уладай на розных узроўнях. Удзельнічалі ў разглядзе многіх пытанняў на пасяджэннях урада, Гродзенскага і Мінскага абласных, Мінскага, Брэсцкага, Гродзенскага гарадскіх, Вілейскага, Крупскага, Мінскага, Маладзечанскага, Рэчыцкага раённых выканаўчых камітэтаў, адміністрацыі Першамайскага раёна г. Мінска.

Былі праведзены сустрэчы з насельніцтвам, працоўнымі калектывамі, а таксама з прадстаўнікамі прафсаюзных арганізацый і грамадскіх аб'яднанняў. У ходзе гэтых сустрэч парламентарыі інфармавалі грамадзян аб заканадаўчай і міжнароднай дзейнасці Савета Рэспублікі, законапраектах, адобраных у ходзе сесій, узаемадзеянні Савета Рэспублікі з органамі мясцовага самакіравання. Такія сустрэчы вельмі карысныя і для парламентарыяў, і для нашых грамадзян. Яны даюць магчымасць лепш даведацца, чым жыве сёння наша грамадства. У час такіх сустрэч грамадзяне ўносяць нямала канструктыўных прапаноў, якія мы можам потым выкарыстоўваць у сваёй заканатворчай дзейнасці.

Пэўная ўвага ўдзялялася таксама рабоце з моладдзю. У прыватнасці, у Савеце Рэспублікі была праведзена сустрэча з членамі Маладзёжнай палаты пры Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў.

Паважаныя калегі!

У міжсесійны перыяд члены Савета Рэспублікі ўдзельнічалі ў шэрагу мерапрыемстваў міжнароднага характару. Нашы прадстаўнікі прынялі актыўны ўдзел у 23-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, якая прайшла ў Баку.

Чарговым крокам у развіцці беларуска-армянскага супрацоўніцтва стала восьмае пасяджэнне Міжпарламенцкай камісіі па супрацоўніцтве Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага сходу Рэспублікі Арменія ў Ерэване. На ім былі разгледжаны пытанні актывізацыі двухбаковага гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння, што асабліва актуальна ў кантэксце працэсу далучэння Арменіі да Еўразійскага эканамічнага саюза.

Шляхі развіцця двухбаковых міжпарламенцкіх кантактаў, гандлёва-эканамічных сувязяў і гуманітарнага супрацоўніцтва абмяркоўваліся на сустрэчах у Мінску з прадстаўнікамі парламентаў Кітайскай Народнай Рэспублікі, Ізраіля і Туркменістана, а таксама ў ходзе візіту ў Тбілісі парламенцкай дэлегацыі на ўзроўні рабочай групы Нацыянальнага сходу па супрацоўніцтве з парламентам Грузіі.

Адным з асноўных напрамкаў у дзейнасці Савета Рэспублікі па-ранейшаму застаецца работа са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб.

Члены Савета Рэспублікі разгледзелі ў рэгіёнах больш як 800 пісьмовых і вусных зваротаў, правялі каля 150 асабістых прыёмаў грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб, у тым ліку 50 выязных, на якіх пабывала амаль 600 чалавек. Аналіз сведчыць, што больш як 40 працэнтаў ад агульнай колькасці разгледжаных парламентарыямі на месцах зваротаў грамадзян вырашаны станоўча.

Вялікая нагрузка па рабоце са зваротамі грамадзян кладзецца на Сакратарыят Савета Рэспублікі. Трэба адзначыць, што ў сувязі з магчымасцю падаваць звароты па электроннай пошце агульная колькасць зваротаў, якія паступілі ў Савет Рэспублікі, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ўзрасла ў 13 разоў. За тры месяцы прыйшло каля 1300 зваротаў, прычым 95 працэнтаў з іх па электроннай пошце. У асноўным яны змяшчаюць прапановы па пытаннях заканадаўства. Гэта сведчыць аб тым, што нашы грамадзяне актыўна ўключыліся ў заканатворчы працэс.

Нягледзячы на адпускны час, сенатары даволі актыўна выступалі ў сродках масавай інфармацыі, выкарыстоўваючы, перш за ўсё, рэгіянальныя газеты, мясцовае радыёвяшчанне, а таксама інтэрнэт. Як станоўчы факт можна адзначыць, што за мінулы перыяд членамі Савета Рэспублікі ў рэспубліканскіх і рэгіянальных перыядычных выданнях было размешчана 120 публікацый.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

У ходзе асенняй сесіі нас чакае напружаная заканатворчая работа. Усяго плануецца разгледзець больш як 40 законапраектаў. Найбольш значных з іх — гэта зацвярджэнне бюджэту Рэспублікі Беларусь на наступны год, ратыфікацыя Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе, разгляд праекта закона «Аб барацьбе з карупцыяй».

Трэць законапраектаў, якія плануецца разгледзець, адносяцца да эканамічнага блоку. У мэтах стварэння больш спрыяльных умоў для функцыянавання суб'ектаў гаспадарання ў розных сферах прадпрымальніцкай, гаспадарчай дзейнасці падрыхтаваны законапраекты «Аб энергазберажэнні», «Аб рынку каштоўных папер» і «Аб чыгуначным транспарце». Уносяцца папраўкі ў кодэксы і законы, якія рэгулююць лізінгавую дзейнасць, работу ўнутранага воднага транспарту. Усе гэтыя законапраекты накіраваны на ўдасканаленне эканамічных адносін і будуць садзейнічаць росту эканамічнага патэнцыялу краіны.

Перад намі таксама стаіць задача ўдасканалення заканадаўчай базы ў мэтах умацавання нацыянальнай бяспекі. Прадугледжваецца разгледзець вялікі пакет законапраектаў, што рэгулююць праваадносіны ў такіх галінах, як абарона інфармацыі, пагранічная бяспека, аператыўна-вышуковая дзейнасць, воінскі абавязак і воінская служба, абарот зброі, увядзенне ваеннага становішча, процідзеянне гандлю людзьмі.

Адной з важных сацыяльных праблем з'яўляецца даступнасць высокаэфектыўных і бяспечных лекавых сродкаў для насельніцтва. Нам з вамі трэба будзе разгледзець праект закона аб лекавых сродках, накіраваны на ўдасканаленне гэтай сферы жыццядзейнасці грамадства.

Больш як 10 праектаў будуць звязаны з ратыфікацыяй міжнародных дагавораў.

У перыяд шостай сесіі будзе прадоўжана работа па ўмацаванні адносін з традыцыйнымі партнёрамі па міжпарламенцкім дыялогу. Вялікую ўвагу плануецца ўдзяліць умацаванню ўзаемадзеяння са стратэгічным партнёрам нашай краіны — Расійскай Федэрацыяй у рамках работы Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, а таксама рэалізацыі Падагульняючага дакумента першага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі і падрыхтоўцы другога Форуму, запланаванага ў наступным годзе ў Вялікім Ноўгарадзе.

Мы таксама прадоўжым актыўную работу ў МПА СНД і Парламенцкай асамблеі АДКБ, планавыя мерапрыемствы якіх пройдуць у Санкт-Пецярбургу.

Па запрашэнні старшыні Вялікага нацыянальнага сходу Турцыі ў сярэдзіне кастрычніка запланаваны афіцыйны візіт парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь у Анкару. Упэўнены, што ён паслужыць далейшаму ўмацаванню беларуска-турэцкіх адносін як у парламенцкай, так і ў гандлёва-эканамічнай, навуковай і гуманітарнай сферах дзейнасці.

Плануем таксама прыняць удзел у 131-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза, дзе прадставім пазіцыю нашай краіны пры абмеркаванні пытанняў дасягнення гендарнай роўнасці і спынення насілля ў адносінах да жанчын, процідзеяння кібернетычнай вайне, нацыянальнага суверэнітэту і неўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў, фарміравання новай сістэмы кіравання воднымі рэсурсамі.

Адным словам, паважаныя калегі, я прашу вас з першага дня работы сесіі актыўна ўключыцца ў заканатворчую дзейнасць, накіраваную на далейшае развіццё нашага грамадства, удасканаленне яго прававой сферы і рост дабрабыту нашых грамадзян.

Дзякуй за ўвагу!

# АДНА РУКА ДАЕ, ДРУГАЯ — ЗАБІРАЕ?

## Страты нашай краіны ад падатковага манеўру Расіі могуць перасягнуць $1 млрд

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам прэм'ер-міністра Міхаіла Мясніковіча, паведамляе БЕЛТА.

«Летась мы, у прынцыпе, дамовіліся аб тым, што Беларусь атрымае ў выніку ўступак у эканамічным саюзе, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Як вядома, у Расіі ажыццяўляюць нейкі падатковы манеўр, у выніку якога мы можам страціць усё тое, пра што дамаўляліся летась з Расійскай Федэрацыяй. Гэта датычыцца пералічэння ў бюджэт Расіі пошлін ад спагнання на мяжы па нафтапрадуктах. Наколькі я ведаю, ідуць перамовы, каб гэту тэму ўрэгуляваць, і яна павінна быць урэгулявана».

«Гэта ненармальна: не паспелі ўвесці ў дзеянне дамоўленасці, тут іх адмяняем фактычна другой рукой, і ў выніку Беларусь можа страціць вялікую суму сродкаў, больш як $1 млрд», — адзначыў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ў прэм'ер-міністра ходам перамоў па гэтым пытанні.

Прэзідэнт у сувязі з гэтым звярнуў таксама ўвагу і на фарміраванне бюджэту. «Мы дамаўляліся, што 1 кастрычніка бюджэт павінен быць сфарміраваны і праект яго ўнесены ў парламент для разгляду. Як тут ідуць справы?» — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама закрануў пытанні маючага адбыцца пасяджэння кіраўнікоў дзяржаў СНД і афіцыйнага візіту прэзідэнта Туркменістана ў Беларусь.

# ПЛАЦІЦЬ ПА РАХУНКАХ

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў у Банка развіцця больш строга ставіцца да спагнання пратэрмінаваных крэдытаў.

Такую задачу ён паставіў, прымаючы з дакладам старшыню праўлення ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» Сяргея Румаса, паведамляе БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы раскрытыкаваў пазіцыю Банка развіцця па спагнанні праблемных пазык і запатрабаваў працаваць не толькі з пазычальнікамі, якія допускаюць пратэрмінаваныя даўгі (у асноўным гэта сельгаспрадпрыемствы), але і з аблвыканкамамі.

«Мы дамаўляліся, што ў банку ніякай дабрачыннасці быць не павінна. Банк павінен функцыянаваць на жорсткіх умовах і падтрымліваць толькі тыя праекты, якія будуць акупляцца, пры гэтым пажадана ў кароткатэрміновай перспектыве», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Сяргей Румас далажыў кіраўніку дзяржавы аб выніках работы Банка развіцця за 9 месяцаў бягучага года, а таксама аб тым, што парадак дня пасяджэнняў кіраўнікоў дзяржаў СНД і Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў сфарміраваны (Сяргей Румас — член Савета Еўразійскай эканамічнай камісіі). Ён паведаміў, што заканчваецца падрыхтоўка падагульняльных дакументаў. Напярэдадні адбыўся савет ЕЭК у рэжыме відэаканферэнцыі. Большая частка пытанняў, якія ўносяцца на Вышэйшы Еўразійскі эканамічны савет, узгоднена, усяго парадак дня налічвае 13 пытанняў.

Звяртаючыся да Сяргея Румаса як да старшыні Беларускай федэрацыі футбола, кіраўнік дзяржавы зазначыў, што трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу на гульню нацыянальнай зборнай. «Калі казаць шчыра, акрамя апошняй гульні БАТЭ, няма на што глядзець і няма чаму радавацца, асабліва зборнай», — сказаў Прэзідэнт. «Трэба сур'ёзную ўвагу звярнуць на нашу нацыянальную зборную, таму што гэта вельмі дрэнны сігнал як для кіраўніка федэрацыі, так і для федэрацыі ў цэлым», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

■ Парламенцкі дзённік

# УСЕ НА СЕСІЮ!

**Учора адкрылася шостая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу пятага склікання. Па словах старшыні верхняй палаты парламента Анатоля Рубінава, сенатарам давядзецца на восеньскай сесіі разгледзець больш за 40 законапраектаў.**

Найбольш знакавыя з іх — зацвярджэнне бюджэту Беларусі на наступны год, ратыфікацыя дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе, разгляд праекта закона аб барацьбе з карупцыяй.

Падчас першага пасяджэння сенатары зацвердзілі рабочыя органы сесіі — сакратарыят і падліковую камісію. Акрамя таго, яны далі згоду на назначэнне Прэзідэнтам Беларусі Ілоны Лядніцкай (Дурасавай) членам праўлення Нацыянальнага банка.

Дарэчы, перад адкрыццём сесіі Пастаянная камісія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па эканоміцы, бюджэце і фінансах выслухала прэзентацыю аднаго амбіцыйнага беларускага праекта — «Тэхналогія прагназавання паводзін супрацоўнікаў REFLEXIO». Праект карысны для кіраўнікоў, якія зацікаўлены ў якасным падборы кадраў.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ** ■

# У АСНОВУ ЗАКОНА — ПАТРАБАВАННІ ЖЫЦЦЯ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Расходы на заработную плату, пенсіі, падтрымку сем'яў з дзецьмі і іншыя сацыяльныя трансферты насельніцтву плануюцца з ростам у сярэднім на 27 працэнтаў.

У сферы ўвагі дэпутатаў таксама пытанні пашырэння рэсурснай базы бюджэту за кошт удасканалення падаткаабкладання банкаўскай і страхавой дзейнасці, стымулявання інвестыцый, а таксама далейшага спрашчэння сістэмы падаткаабкладання.

Вялікі блок законапраектаў непасрэдна датычыцца развіцця эканомікі і фінансавай сферы. У прыватнасці, плануецца ўдасканаліць парадак стварэння і дзейнасці гаспадарчых таварыстваў. Намячаюцца прынцыповыя рашэнні па развіцці рынку каштоўных папер, пашырэнні сферы прымянення лізінгу.

Больш рацыянальна выкарыстоўваць унутраныя рэсурсы дасць магчымасць прыняцце праектаў новага Ляснога кодэкса, Закона «Аб энергазберажэнні». Рэалізацыі пераваг, звязаных са стварэннем Адзінай эканамічнай прасторы, будуць садзейнічаць прававыя навацыі ў транспартнай сферы. Шэраг мер накіраваны на прасоўванне айчыннай прадукцыі на сусветны сельскагаспадарчы рынак. Размова, у прыватнасці, ідзе аб прывядзенні нацыянальных ветэрынарна-санітарных правілаў у адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі і стварэнні надзейнай сістэмы кантролю бяспекі прадуктаў жывёльнага паходжання.

Самым сур'ёзным чынам трэба падысці да ратыфікацыі Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. Вынікам інтэграцыі павінна стаць рэальнае паляпшэнне якасці жыцця людзей. А значыць, неабходна забяспечыць максімальную эфектыўнасць работы беларускай эканомікі ў новых умовах.

Пытанні мадэрнізацыі і павышэння канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі будуць разглядацца не толькі ў заканадаўчай плоскасці. У лістападзе мы плануем правесці парламенцкія слуханні па такой важнай тэме, як развіццё дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

Не менш адказныя задачы трэба будзе вырашаць і ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва. Да другога чытання рыхтуецца ініцыяваны дэпутатамі законапраект, які забяспечвае большую ўзгодненасць работы палат парламента.

Плануецца таксама пашырыць паўнамоцтвы органаў мясцовага кіравання і самакіравання пры ажыццяўленні фінансавай і гаспадарчай дзейнасці, прадаставіць ім больш магчымасцяў для вырашэння канкрэтных праблем насельніцтва.

Шэраг законапраектаў накіраваны непасрэдна на абарону канстытуцыйных правоў і законных інтарэсаў грамадзян, уключаючы аптымізацыю механізма кампенсавання банкаўскіх укладаў насельніцтва, рэалізацыю права на замену па рэлігійных перакананнях воінскай службы альтэрнатыўнай.

Лагічным развіццём прынятых на мінулай сесіі важных рашэнняў у сферы аховы здароўя стане прыняцце законапраекта па пытаннях лекавага забеспячэння.

Ва ўмовах нарастаючай глабальнай нестабільнасці, калі ваенная пагроза наблізілася непасрэдна да нашых рубяжоў, дзяржава абавязана ўзмацніць увагу да пытанняў забеспячэння асноўнага права сваіх грамадзян — права на жыццё і бяспеку. Менавіта з такіх пазіцый мы будзем разглядаць заканадаўчыя ініцыятывы, звязаныя з умацаваннем абараназдольнасці краіны, бяспекай нашых граніц, воінскім абавязкам і воінскай службай, абароннай інфармацыі.

Не менш важныя пытанні грамадскай бяспекі, зніжэння ўзроўню злачыннасці. У гэтым плане трэба адзначыць вялікую работу, якую правялі дэпутаты сумесна з кампетэнтнымі органамі, па стварэнні механізма аператыўнага рэагавання на з'яўленне новых наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсораў і аналагаў, узмацненні адказнасці за ўжыванне наркотыкаў, абмежаванні рэкламы алкагольнай прадукцыі і тытунёвых вырабаў.

Асобна трэба сказаць аб карэкціроўцы крымінальнага, крымінальна-працэсуальнага і крымінальнага выканаўчага заканадаўства, заканадаўства аб адміністрацыйных правапарушэннях. Галоўным тут з'яўляецца забеспячэнне сацыяльнай справядлівасці пры прымяненні пакарання, папярэджанне і прафілактыка правапарушэнняў. Прадугледжваюцца дэкрыміналізацыя асобных злачынстваў, вызваленне ад крымінальнай адказнасці за няцяжкія злачынствы, пашырэнне прымянення альтэрнатыўных пазбаўленню волі відаў пакаранняў, а таксама ўвядзенне інстытута дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве з падазроным.



Фота БЕЛТА.

Вельмі вялікую ролю ў забеспячэнні нацыянальнай бяспекі адыгрывае ўмацаванне аўтарытэту Беларусі на міжнароднай арэне, што таксама з'яўляецца адным з важнейшых напрамкаў дзейнасці дэпутацкага корпуса.

Новымі ініцыятывамі адзначана работа з нашымі стратэгічнымі партнёрамі ў Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі, Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД і Парламенцкай асамблеі АДКБ.

Даволі плённа мы працуем у такіх аўтарытэтных міжпарламенцкіх арганізацыях, як ПА АБСЕ, дзе рэзалюцыі, падрыхтаваныя беларускім бокам, заўсёды атрымлівалі ўсеагульнае адабрэнне. У гэтым годзе быў падтрыманы дакумент, прысвечаны абароне і пашырэнню сацыяльна-эканамічных правоў у рэгіёне АБСЕ.

З 2011 года беларускія дэпутаты рэгулярна прымаюць удзел у генеральных асамблеях МПА АСЕАН. Для нас гэта ўнікальная дыялогавая пляцоўка для падтрымання сувязяў з краінамі гэтага рэгіёна.

На 35-й Генеральнай асамблеі гэтай арганізацыі асаблівая ўвага была ўдзелена абмеркаванню новых падыходаў да супрацоўніцтва паміж парламентамі — членамі МПА АСЕАН і парламентамі краін-назіральнікаў.

Набыты вопыт трэба больш актыўна выкарыстоўваць і пры ўзаемадзеянні з Лацінаамерыканскім парламентам, тым больш што пэўныя напрацоўкі ў нас ужо ёсць.

Далейшае развіццё атрымала міжпарламенцкае супрацоўніцтва на двухбаковай аснове. На восьмым пасяджэнні Міжпарламенцкай камісіі па супрацоўніцтве Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага сходу Рэспублікі Арменія, якое прайшло ў горадзе Ерэване, нараўне з абмеркаваннем перспектыў развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, шляхоў павышэння эфектыўнасці міжпарламенцкіх сувязяў была прынята Заява аб барацьбе з фашызмам, нацызмам, ксенафобіяй і тэрарызмам.

У канструктыўным рэчышчы прайшоў візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі ў Грузію.

У сваю чаргу, Рэспубліку Беларусь наведалі дэлегацыі В'етнама, Ізраіля, Кітая, Малайзіі, Судана, Туркменістана. Адбыліся сустрэчы з пасламі Ірака і Сербіі.

У канцы верасня прайшоў візіт у Рэспубліку Беларусь старшыні камітэта Дзяржаўнай думы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі па фінансавым рынку.

У наступны перыяд нас чакае напружаная праграма міжпарламенцкай дзейнасці. Ужо сёння беларуская дэлегацыя накіруецца ў Швейцарыю для ўдзелу ў асеннім пасяджэнні ПА АБСЕ.

Беларускія дэпутаты прымуць удзел у рабоце 131-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза, якая таксама пройдзе ў горадзе Жэнева. Сярод важнейшых пытанняў форуму — выбары новага старшыні МПС, разгляд ходу рэалізацыі стратэгіі МПС на 2012—2017 гады, а таксама аспектаў супрацоўніцтва з арганізацыямі ААН.

Прадоўжыцца актыўная работа ў рамках міжпарламенцкіх структур, створаных на прасторы СНД. Важным мерапрыемствам тут стане правядзенне 47-й сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, на якой плануецца прыняцце бюджэту Саюзнай дзяржавы на 2015 год. Самая пільная ўвага будзе ўдзелена знакавай падзеі нашай гісторыі — 15-годдзю з дня падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы.

У гэтым годзе горад Мінск выбраны месцам правядзення выязнога пасяджэння Пастаяннай камісіі АДКБ па пытаннях абароны і бяспекі, а таксама міжнароднай канферэнцыі па праблематыцы развіцця выбарчых працэсаў на прасторы СНД.

Чакаецца, што Беларусь наведаюць парламенцкія дэлегацыі Венесуэлы, Брунея, Мексікі, М'янмы. Вядзецца падрыхтоўка візітаў нашых дэлегацый у Чэхію і Шры-Ланку.

Традыцыйна мы прымаем самы актыўны ўдзел у Міжнародных парламенцкіх гульнях, мэтамі якіх з'яўляюцца ўмацаванне дружбы паміж парламентарыямі краін свету і прапаганда здаровага ладу жыцця. Літаральна заўтра дэлегацыя Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь накіроўваецца ў Маскву для ўдзелу ў пятых гульнях. Карыстаючыся выпадкам, хачу пажадаць нашым спартсменам поспехаў.

Паважаныя калегі!

Час ставіць перад краінай усё больш складаныя, адказныя задачы, і нам даводзіцца прымаць няпростыя, часта нестандартныя рашэнні. Галоўны індыкатар іх правільнасці і вернасці выбранага шляху — бяспека, дабрабыт, упэўненасць у будучым нашых грамадзян. Паколькі менавіта гэта з'яўляецца канчатковай мэтай усёй нашай дзейнасці. Непасрэдная работа з людзьмі была і застаецца найважнейшай задачай, на што пастаянна нацэльвае нас кіраўнік дзяржавы.

Удзел у вырашэнні актуальных праблем развіцця рэгіёнаў, вывучэнне меркаванняў нашых выбаршчыкаў аб эфектыўнасці дзеяння улад усіх узроўняў, веданне канкрэтных патрэб і праблем людзей, шляхоў іх вырашэння даюць магчымасць нам удакладняць планы, карэкціраваць іх у адпаведнасці з чаканнямі грамадства і такім чынам рэальна павышаць якасць і рэзультатыўнасць нашай работы. А гэта сёння самае галоўнае.

На заканчэнне, паважаныя дэпутаты, хачу падзякаваць вам за якасную падрыхтоўку сесіі і пажадаць усім нам паспяховай работы.

■ Парламенцкі дзённік

# АДКАЗНАСЦЬ ЗА НЕЗАКОННАЕ ПАЛЯВАННЕ І РЫБАЛОЎСТВА ПАВЯЛІЧЫЦЦА

**На першым пасяджэнні пятай сесіі Палаты прадстаўнікоў дэпутаты прынялі 7 законапраектаў. Сярод іх — ратыфікацыя двух міжнародных дагавораў, а таксама змены і дапаўненні ў законы аб зброі, абароне інфармацыі, адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні.**



Фота БЕЛТА.

У кулуарах сесіі Палаты Прадстаўнікоў.

Перад самым адкрыццём сесіі ў размове з журналістамі **Віктар ГУМІНСКІ, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў**, заўважыў, што адным з самых важных законапраектаў гэтай восені будзе ратыфікацыя дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе.

— Цяпер ідзе праца над гэтым дакументам у камісіі па міжнародных справах. І пытанні, як правіла, звязаныя з інтарэсамі дзяржавы, ад дэпутатаў ужо ёсць. Трэба паклапаціцца, каб не атрымалася, што пасля падпісання гэтага дагавора наша краіна акажацца ў нявыгадным становішчы.

Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў паведаміў аб планах камісіі па міжнародных справах на бліжэйшае пасяджэнне па гэтай тэме. Там выступіць Сяргей Румас, член савета Еўразійскай эканамічнай камісіі ад Беларусі.

Таксама Віктар Гумінскі паведаміў, што наша парламенцкая дэлегацыя едзе на восеньскае пасяджэнне Парламенцкай Асамблеі АБСЕ.

— Менавіта там парламентарыі 56 краін, у тым ліку і Злучаных Штатаў, могуць абмеркаваць актуальныя пытанні. Наша краіна актыўна выкарыстоўвае гэту пляцоўку для прасоўвання сваіх інтарэсаў па ўсіх трох вымярэннях, якімі займаецца ПА АБСЕ: ваенна-палітычным, эканамічным і чалавечым. Мяркуем, што на сёлетняй сесіі будзе вельмі сур'ёзная размова аб праблемах, якія ўзнікаюць сёння не толькі ў рэгіянальным маштабе, але і ў глабальным — гэта падзеі ва Украіне і на Блізкім Усходзе.

Падчас пасяджэння цікавасць выклікаў праект закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь». Згодна з ім, уносяцца змены і дапаўненні ў Крымінальны кодэкс, Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Згодна з дакладам **Сяргея УШКЕВІЧА, члена Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы**, прадугледжваецца адказнасць (штраф, арышт, выпраўленчыя работы на тэрмін да двух гадоў) за незаконную здабычу рыбы або іншых водных жывёл, а таксама паляванне. Пералічаныя віды пакаранняў будуць прымяняцца, калі парушэнне паўтарылася на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж злачынства.

Таксама ўчора ў першым чытанні парламентарыі прынялі праект закона «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях стварэння Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь і дзейнасці іншых дзяржаўных органаў (арганізацый)».

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■ Рэха падзеі

# ПА ЗАКОНАХ ГІСТАРЫЧНАЙ ПРАЎДЫ

**Журналіст — патрыёт сваёй краіны. Гэтыя словы неаднойчы гучалі ўчора ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. І невыпадкова. Падчас канферэнцыі «Патрыятызм: гісторыя і сучаснасць» сабраліся кіраўнікі рэспубліканскіх і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі. Сустрэліся літаральна ў самым сэрцы айчыннага патрыятызму.**




Фота БЕЛТА.

Сімвалічна, што менавіта тут, дзе кожны прадмет, кожная дэталь сведчаць аб недапушчэнні і нават барацьбе з фальсіфікацыямі не толькі на інфармацыйных прасторы, а і ўвогуле ў грамадстве. У месцы, якое быццам заклікае нас, уладароў пяра і эфіру, несці гістарычную праўду ў сваіх публікацыях і тэле- радыёсюжэтах.

— Беларусам трэба падтрымліваць і ўмацоўваць адзінства народа, — пераканаваны **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр РАДЗЬКОЎ**. — Мы цяпер асабліва адчулі, наколькі важна быць адзінымі, разумець сваю Радзіму, гістарычнае мінулае, берагчы гэта, падтрымліваць і ўмацоўваць сваё адзінства. Важна разумець, што пры раз'яднанасці адразу пачынаюцца праблемы, прычым не толькі эканамічныя і палітычныя, але і ваенныя, падобных прыкладаў цяпер шмат.

— Шмат у чым людзей аб'ядноўвае гістарычнае мінулае і традыцыі. Сведчыць пра гэта і той факт, што Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны стаў важным месцам для нашых людзей, — сказаў Аляксандр Радзькоў. — Прэзідэнт не адноойчы гаварыў пра тое, каб гэты музей стаў лепшым у свеце помнікам пакутам і гераізму, які праявілі людзі, у тым ліку беларусы. З першага дня працы ў музей прыходзіць шмат людзей розных узростаў, яны разумеюць, што гісторыя нас аб'ядноўвае. Беларусам складана знайсці аб'ядналыныя сілы, паколькі гісторыя краіны няпростая: было Вялікае Княства Літоўскае, Рэч Паспалітая, Масковія, але беларусы выпакутавалі ўсё-ткі сваё адзінства. І перш-наперш якраз у выпрабаваннях Вялікай Айчыннай вайны. І праз прэсу, тэлебачанне і радыё мы будзем пераконваць людзей, што не дапусцім супярэчнасцяў і ваенных канфліктаў унутры краіны, — упэўнены першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі.

— Сёння Беларусь з'яўляецца прыкладам маральных адносін грамадства і дзяржавы да праблем сучаснасці, — мяркуе **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**. — Беларускае нацыянальнае інфармацыйнае поле павінна ўмацоўваць нашы маральныя прыярытэты і арыенціры, выхоўваць грамадзянскую адказнасць, патрыятызм, гістарычную і сучасную перспектыву. СМІ з выкарыстаннем сучасных тэхналогій уплываюць не толькі на розумы і сэрцы людзей, але і на дзейнасць краін. Мы бачым, што інфармацыйныя плыні не заўсёды фарміруюцца ў інтарэсах краіны і народа. Неабходна сур'ёзна і асцярожна ставіцца да слова і да таго, што дэманструецца на экранах тэлевізараў і гучыць па радыё.

Кіраўнік ведамства таксама падкрэсліла, што інтэрнэт уплывае на развіццё самых складаных працэсаў фарміравання інфармацыйных плыняў, аднак нацыянальная інфармацыйная прастора, на яе думку, павінна заставацца лідарам фарміравання грамадскай думкі ў краіне, і для гэтага ёсць усе рэсурсы — творчыя, кадравыя і структурныя. Аднак, як выказаліся многія ўдзельнікі канферэнцыі, інтэрнэт — гэта і поле для негатыўных поглядаў, для перабольшвання рэчаіснасці і нават для мэтанакіраванага падману. Таму было б добра ўдасканаліць заканадаўчую базу, якая, у першую чаргу, рэгулявала б адказнасць за кожнае слова, выказанае ў сеціве.

Гучала шмат прапаноў, як палепшыць работу СМІ, прапаноўваліся формы павелічэння падпісчыкаў, гледачоў, слухачоў і наведвальнікаў інтэрнэт-рэсурсаў. І ў гэтым сэнсе, на думку выступоўцаў, важна кансалідаваць беларускія медыя. Адна са спроб — стварэнне інтэрнэт-партала «СМІ Беларусі», які, дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы пачне сваю працу ў канцы гэтага года. На прасторы краін СНД такіх прыкладаў пакуль няма, няшмат аналагаў і ў свеце.

**Намеснік дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Беларусі Станіслаў ЗАСЬ**, у сваю чаргу, распавёў журналістам пра супрацьстаянне ў сферы сэнсаў. «Гэта супрацьстаянне розных ідэалогій, маральных каштоўнасцяў, культур і рэлігій, — патлумачыў ён. — Чаму я падымаю гэтую тэму? Проста больш за ўсё фарміруюць гэтую сферу сродкі масавай інфармацыі, якія працуюць з людзьмі і ствараюць сэнсавы кантэкст усіх падзей. Зараз мы бачым шмат прыкладаў, калі спрабуюць пераасэнсаваць некаторыя гістарычныя падзеі, а такія гістарычныя і ідэалагічныя вычварэнствы вельмі небяспечныя».

Такім чынам, пытанняў для абмеркавання было шмат.

**Вераніка КАНЮТА**

■ Ведай нашых!

## МІКАЛАЙ ЦУДАТВОРАЦ ПЕРАМОГ

**Памятная манета Нацыянальнага банка Беларусі «Свяціцель Мікалай Мір Лікійскіх Цудатворац» атрымала 3-е месца ў намінацыі «Залатая манета года» на восьмым міжнародным конкурсе «Манетнае сузор'е-2014».**

«Спецыялісты банкаў і манетных двароў, эксперты ў галіне нумізматыкі з розных краін свету высока ацанілі тэхнічную рэалізацыю і якасць чаканкі манеты, а таксама адзначылі высокую кампазіцыйную цэласнасць выканання і дэталізацыю малюнкаў сцэн жыцця свяціцеля Мікалая Цудатворца», — каменуе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка.

На конкурс было заяўлена больш за 260 памятных манет і 25 манетных серый з 31 краіны. У журы ўваходзілі прадстаўнікі нацыянальных музеяў Арменіі, Латвіі, Расіі, нумізматычных выдавецтваў і таварыстваў, аўкцыённых і выдавецкіх дамоў, камерцыйных банкаў з Аўстраліі, Аўстрыі, Беларусі, Германіі, Італіі, Казахстана, Кыргызстана, Мексікі, ЗША, Францыі, Чэхіі, а таксама эксперты ў галіне нумізматыкі.

Дарэчы, за 8-гадовую гісторыю «Манетнага сузор'я» 16 памятных манет, а таксама серыя памятных манет «Знакі задыяка», выпушчаныя ў абарачэнне Нацыянальным банкам Беларусі, прызнаваліся журы лепшымі ў сваіх намінацыях.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■ Надвор'е

## ПАДМАРОЗІЦЬ ДА МІНУС 5

**Напрыканцы тыдня тэрыторыя нашай краіны будзе ў зоне ўплыву халоднага антыцыклону, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

На выхадныя ў Беларусі захаваецца павышаны фон атмасфернага ціску. Будзе без істотных ападкаў, а ўначы і раніцай у асобных раёнах туман. Уначы стане і сапраўды холадна, калі тэмпература паветра знізіцца да плюс 1-6 градусаў, а на глебе і месцамі ў паветры чакаюцца замаразкі да 0 — мінус 5 градусаў. Тэндэнцыя на пахаладанне будзе назірацца і ўдзень, бо ў суботу чакаецца плюс 9-15, а ў нядзелю — толькі 7-14.

Халоднае і сухое надвор'е захаваецца ў нас і на наступным тыдні. Уначы амаль паўсюдна замаразкі да мінус 5 градусаў, а ўдзень паветра будзе праграваецца не больш, чым да 6-13 цяпла. Такім чынам, сярэднесутачная тэмпература ў большасці рэгіёнаў краіны будзе меншай за плюс 8 градусаў. Мне здаецца, што неўзабаве ў кватэры павінны даць цяпло...

**Сяргей КУРКАЧ**

■ На слыху

## КАБ НЕ ГІНУЛІ Ў КАР'ЕРАХ...

### На Віцебшчыне праведзена абследаванне больш за 170 кар'ераў

Таксама была праверана арганізацыя работы па папярэджанні гібелі дзяцей на водах, дарогах і падчас пажару.

— Найбольшае праблемнае пытанне — забеспячэнне бяспекі дзяцей на пясчаных кар'ерах, — сказаў «Звяздзе» **Антон ВОЛКАЎ, старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці**. — Выпадкам гібелі і траўміравання дзяцей спрыяў фармальны падыход адказных асоб. Пасля здабычы пяску тэхнікай на многіх кар'ерах утварыліся шматлікія небяспечныя стромы. Доступ да кар'ераў часта не абмежаваны. Не было забараняльных знакаў аб небяспецы знаходжання. І гэтыя парушэнні застаюцца без належнага рэагавання органаў мясцовай улады і кіравання, кантралюючых службаў. Не заўсёды своечасова арганізуецца абследаванне небяспечных аб'ектаў. А пры выяўленні небяспекі эксплуатацыі не ўсюды прымаюцца меры па ліквідацыі пагрозы абвалу стромых схілаў

Дарэчы, пасля трагічнай гібелі ў чэрвені хлопчыка, якога засыпала пяском у кар'еры, **Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама**, даў указанне навесці парадак на такіх аб'ектах. Але, канешне, ніхто не здымае адказнасці з бацькоў і сваякоў дзятвы.

— Такое пачуццё, што бацькі проста пераклалі на плечы работнікаў школ, устаноў культуры і іншых клопат пра выхаванне дзяцей. І дарослыя забылі, што дзецьмі трэба займацца, — сказаў віцэ-губернатар падчас абмеркавання тэмы прафілактыкі гібелі і траўматызму.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## УСТАНОЎЛЕНА АСОБА НАПАДНІКА НА АБМЕННІК

**Следчы камітэт паведаміў падрабязнасці нашумелага нападу на абменнік у мінскім гандлёвым цэнтры «Шчасце». Падазраваным з'яўляецца мужчына 1991 года нараджэння, жыхар Мастоўскага раёна.**

Зараз ён знаходзіцца ў адной са сталічных бальніц. Каля яго палаты выстаўлены пост аховы. Тым часам следчыя працягваюць дасследаваць усе абставіны інцыдэнту: дапытваюць сведкаў, вывучаюць запісы з камер відэаназірання. У падазраванага адабраны прадмет, падобны на пісталет сістэмы Макарава, па якім таксама прызначаны экспертызы агнястрэльнай зброі.

Нагадаем, што ў сераду мужчына пракраўся ў абменны пункт і некалькі гадзін пагражаў забойствам дзяўчыне-касіру, каб праваахоўныя органы дазволілі яму бесперашкодна выйсці са скрадзенымі грашыма. Аднак у выніку спецаперацыі «Алмаза» нападнік здолеў абясшкодзіць. Жыццю дзяўчыны нічога не пагражае.

**Тарас ШЧЫРЫ**

ЗВЯЗДА
НАПЕРАД У МІНУЛАЕ
3 БЕЛАРУСЬ
Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# ВАНДРУЕМ З ПЕСНЯМІ,

## або Як лабчанкі захоўваюць народную мудрасць



**Ісціна, якой нікога не здзівіш, — гэта тое, што песня дапамагае чалавеку спакон веку жыць. А вось праграма «Наперад у мінулае» тэлеканала «Беларусь 3» умее здзіўляць і радаваць сваіх прыхільнікаў сустрэчамі з народнай песняй. Бо, як вядома, менавіта яна суправаджае нас ад нараджэння да смерці, падтрымлівае ў хвіліны перамог і расчараванняў, расказвае гісторыі пра мінулае, паказваючы нас цяперашніх. Аднак нельга абмінаць увагай той факт, што непаўторнасць гучання слоў і музыкі па-рознаму адлюстроўваюцца ў залежнасці ад выканаўцы. Таму што песню нельга не прапускаць праз душу. Мы працягваем дзяліцца з вамі ўбачаным у вандроўках па беларускай глыбінцы разам са здымачнай групай. Сёння будзем знаёміцца з творчасцю фальклорнага гурта «Лабчанка» з Лунінецкага раёна — занатуем для сябе старонку новых уражанняў пра нашу песенную культуру.**

— Вёска Лобча быццам заўсёды была ў цэні іншых населеных пунктаў. Але цяпер яна вельмі славутая і за межамі нашага краю. Таму што жыве тут чалавек, які праслаўляе, піша байкі пра гэтую вёску, занатоўвае яе гісторыю, — дзеліцца са здымачнай групай краязнаўца Наталля Канапацкая.

Размова ідзе пра Настассю Якавец — жанчыну можна лічыць прызнанай фальклорнай славутасцю. Менавіта яна з моманту ўтварэння фальклорнага гурта «Лабчанка» і да сёння з'яўляецца яго ўдзельніцай і лідарам.

Перш чым пачнём знаёміцца з Настассяй Іванаўнай і мясцовым фальклорным калектывам, узгадаем пра назву самой вёскі Лобча. Лічыцца, быццам яна паходзіць ад слова «лоб», таму што быў тут некалі пан, які менавіта гэтым месцам і вылучаўся. Вёска была адметная сваёй царквой (пригадваецца з XIX стагоддзя), пабудаванай у гонар святой пакутніцы Варвары. І што цікава, хоць з 60-х гадоў XX стагоддзя яна разбурана, але гэтае свята — Варвары — дагэтуль адзначаецца жыхарамі. 17 снежня тут паўсюдна выхадны дзень, і ў вёсцы жыхары ладзяць святочны прыём. ...Разам з царквой прыгадвалася некалькі паклонных крыжоў, якія таксама былі знішчаны. Але дзякуючы ініцыятыве мясцовай настаўніцы Алены Мелех, якая ўзялася за іх адраджэнне з жыхарамі вёскі, часткова яны сёння адноўлены. І крыжы можна таксама пабачыць як святыні і абярэгі паселішча. А людзі працавітыя, таленавітыя і настойлівыя ў сваіх імкненнях.

Сам калектыў «Лабчанка» распачаў існаванне ў 1984 годзе, і сёлета ўжо адзначае сваё 30-годдзе. У ім 9 чалавек. З першай сваёй рэпетыцыі ён аб'ядноўвае сапраўдных аматараў музыкі, якія імкнуліся захаваць творы мясцовага фальклору. Падчас запісу праграмы «Наперад у мінулае» пашчасціла не толькі пачуць спеў, байкі і казкі Настассі Іванаўны, але і распытаць яе пра мясцовыя традыцыі. Дарэчы, дзякуючы калектыву тут адноўлены такія народныя абрады, як «Запоіны», «Зажынкі», «З ралцэм» і многія іншыя. Прашу расказаць мне пра абрад «З ралцэм».

**Як адзначаюць мясцовыя жанчыны, сёння можна заўважыць і сярод моладзі жаданне вышываць і ствараць нешта самім. Відаць, самаробнае зноў у трэндзе.**

— Калі дзіця нараджаецца, то завуць бабку-павітуху, яна купае першы раз дзіця. А вось на Вялікдзень жанчына, якая нарадзіла, ідзе да гэтай бабкі з падарункам. Тая ж чакае, і суседку пакліча, і стол нарыхтуе, — тлумачыць сутнасць абраду Настасся Іванаўна.



Як выяўляецца, самы любімы абрад тут спраўляюць на Троіцу — гэта «Ваджэнне куста». Жанчыны, дзяўчаты і дзеткі збіраюцца, плятуць вянок, а потым ходзяць па хатах і людзей велічаюць, добрага ўраджаю ім зычуць. Гэтае дзейства адбываецца і цяпер. І, што важна, удзельнічаюць у ім толькі жанчыны, мужчын нельга браць. Таксама не абыходзіцца без песні і вяселле. Кожны крок, кожнае дзеянне мае сваё музычнае суправаджэнне. А як дажынкі, то «пляпі снапа»: рабілі вянок з калосся, абвязаўшы яго чырвонай стужкай, і ў хаце ставілі за абразы.

Уменне ўсё рабіць сваімі рукамі распаўсюджвалася на розныя справы. І шылі, і ткалі, і вышывалі. Як адзначаюць мясцовыя жанчыны, сёння можна заўважыць і сярод моладзі жаданне вышываць і ствараць нешта самім. Відаць, самаробнае зноў у трэндзе. А калі глядзіш на строі калектыву, то чарговы раз пераконваешся — такое спалучэнне колераў, узораў не можа не радаваць вока...

Народны фальклорны калектыў «Лабчанка» вядомы як удзельнік свят і народных абрадаў, усе выступленні яго надзвычай яркія і відовішчныя. Званне «народны» ён атрымаў у 1991 годзе, але незалежна ад рэгалій яго ўдзельнікі вось ужо тры дзясяткі гадоў радуюць сваімі спевамі (песні выконваюцца ў асноўным у трохгалосым варыянце з падгалоскам) беларускую і замежную публіку. Так, напрыклад, у 2008 годзе калектыў прымаў удзел у міжнародным фестывалі фальклору «Песні балот» у г. Любліне, а ў 2009-м удзельнічаў у фестывалі «Алень па бору ходзіць» (праходзіў у Бяла-Падляскім ваяводстве), дзе правёў некалькі канцэртаў з песнямі і гумарэскамі, а таксама прадэманстраваў некаторыя абрады.

Тут вы пачуеце гаворку, блізкую да ўкраінскай мовы, што і ў саміх песнях ярка прасочваецца:

*«А у нашому сэлі добрі*
*хлопці москалі,*
*Гэй, гэй, гой да люлі,*
*добрі хлопці москалі,*
*Добрі хлопці москалі вэдуть коней*
*до воды,*
*Вэдуть конэй до воды*
*за шовкові поводі.*
*Сталы думать да гадать,*
*дэ б нам конэй напойвать...»*

З прадстаўленых песень у кожнай вечная тэма — каханне, але адлюстравана яно ў розных сітуацыях. Закрануўшы чарговы раз тэму ўзаемаадносін паміж дзяўчатамі і хлопцамі, просім успомніць нешта і пра маладосць.

— Як я была дзеўкаю, то хлопцы хадзілі з гарэлкаю, а як стала маладзіцаю, ніхто не ідзе нават з вадзіцаю, — трымае зноў адказ у жартаўлівым тоне Настасся Якавец. — Як той казаў, выйсці замуж не напасць, галоўнае, замужам не прапасці. Трэба замуж ісці не за ўсякага. І любоў не каляска, трэба ведаць ласку. Каб прываражыць, трэба рыбаю яго карміць.

Што ні песня ў выкананні калектыву — абавязкова знойдуцца радкі, дзе схавана народная жыццёвая мудрасць:

*«... Серце мое ти пізнаеш,*
*Якщо вірно покохаеш».*

А бывае і каханне вернае, але бацькі лепшай долі дзецям шукаюць:

*«Чэрэз сад вышнёвый*
*Стэжэнька вуззэнька,*
*Ходіла дівчына*
*Дівчына Марусенька...*
*Вже сонце заходіть*
*За чорную хмару,*
*А маты знаходіть*
*Своїй доці пару.*
*А маты знаходіть богатого сына,*
*А до мэнэ ходіть*
*Бідний сіротіна.*
*Він до мэнэ ходіть,*
*Хочэ мэнэ браты,*
*То не розлучай, моя родна маты».*

Здавалася б, і час ужо не той, і жыццё дыктуе іншыя звычаі, аднак недзе, няхай на ўзроўні проста памяці, адгукаецца цеплынёю ўспамін пра ўласныя родныя мясціны, пра бяседы ў сямейным коле, і кожнаму хочацца лепшай долі. Але ці будзе гэта ўсё, калі не захаваем мінулае ў сабе і для сябе?

**Алена ДРАПКО.**
**Фота аўтара**

# НАПЕРАД, ПА НАТХНЕННЕ!

**Фальклорныя экспедыцыі здымачнай групы праграмы «Наперад у мінулае» працягваюцца. У першай палове кастрычніка гледачы тэлеканала «Беларусь 3» змогуць пазнаёміцца з фальклорным аўтэнтычным гуртом «Крынічка», пабываўшы ў вёсцы Пагародна Воранаўскага раёна, і завітаць у вёску Лобча Лунінецкага раёна на сустрэчу з фальклорным гуртом «Лабчанка».**

Воранаўскі раён Гродзенскай вобласці вызначаецца сваёй культурай і песеннымі адметнасцямі. Гэта вельмі блізкая тэрыторыя да Літвы. Адзін час навукоўцы вызначалі гэты рэгіён як «Чорная Русь» — такі кавалачак славянскай зямлі на балцкіх тэрыторыях. Блізкасць да Літвы і літоўскай культуры (а ў нацыянальным складзе там усё ж больш польскага насельніцтва) у выніку стварае сімбіёз трох культур на славянскай аснове: польскай, літоўскай і беларускай.

— Агульныя рысы гэтых трох культур праяўляюцца тым, што была адна агульная дзяржава. Але ж у кожнага народа ёсць свае асаблівасці. Асаблівасці ў песенным выкананні, з-за гучання рытму мовы, таму ў песеннай культуры з'яўляюцца асаблівыя пункты, — расказвае **этнограф Сяргей ВЫСКВАРКА.** — Іх няўзброеным вокам не заўважыць, але спецыялісты ўсё роўна будуць адзначаць розныя словы, якія, можа, у іншых рэгіёнах не прысутнічаюць, а толькі ў гэтым. На песенную культуру ўплывае змена светапогляду народа. З кожным новым пакаленнем з'яўляюцца новыя рысы, але знікаюць нейкія са старых. Для рэгіёна Воранаўскага раёна характэрна шматгалоссе кантавага тыпу. Вельмі складанымі рысамі адзначаюцца нават калыханкі. Не проста ўнісонным гучаннем, а некалькімі дэтанічнымі рытмічнымі формамі гучання гэтых спеваў. Каляндарна-абрадавыя цыклы песеннай творчасці самыя старажытныя, архаічныя ва ўсёй славянскай культуры. Таму важна захаваць рэгіянальныя асаблівасці песеннай культуры гэтага рэгіёна, як і іншых у Беларусі. Бо співаюць так, як спяваюць старыя, сёння ўжо могуць не ўсе.

Калі жадаеце даведацца больш і пачуць непаўторны песенны матэрыял, то не прапусціце **выпуск праграмы «Наперад у мінулае» 5 кастрычніка ў 11.10 (9 кастрычніка паўтор у 15.30) на тэлеканале «Беларусь 3».** І зможаце не толькі даведацца пра гісторыю, легенды, традыцыі гэтага рэгіёна, але і пачуеце, якую песню ў новым гучанні для свайго рэпертуару абярэ госця праекта Ганна Благава.

Не менш захаплялльная вандроўка адбудзецца і ў вёску Лобча Лунінецкага раёна. Калі **12 кастрычніка** вы не прапусціце новы выпуск праграмы, то даведаецеся пра рэдкія паданні, абрады, а яшчэ пачуеце песні ў выкананні фальклорнага гурта «Лабчанка» і ў сучаснай апрацоўцы гасцей праграмы, удзельнікаў групы «Аўра».

## АЎТОРАК, 7 КАСТРЫЧНІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.55** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.15** Зона Х.
**8.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на свята Прасвятой Дзевы Марыі Разарыі.
**9.10, 21.45 Серыял «След».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.05 Серыял «Земскі доктар. Жыццё нанова».**
**12.10** Дзень у вялікім горадзе.
**13.15, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-2».**
**14.05 Серыял «Такое звычайнае жыццё».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 1.25 Серыял «Маша ў законе!».**
**17.30** Беларуская часінка.
**19.20, 0.35** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**23.45** Вечар цяжкага дня.
**1.15** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.40 Серыял «Сашка».**
**10.15** Кіпень.
**10.35, 22.50 Баявік «Кулінар-2».**
**11.45, 21.35 Серыял «Віртуозы».**
**12.55** Ікра.
**13.25, 18.50 Серыял «Універ».**
**14.30 Серыял «Фізрук». Заключныя серыі.**
**15.35** «Comedy woman».
**17.50, 0.00 Меладрама «Трыццацігадовыя».**
**20.55** Рэальны свет.
**21.25** КЕНО.
**23.55** Хачу ў тэлевізар!

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 13.30, 19.20, 0.15** «Калейдаскоп».
**8.15 «Таленты і паклоннікі». Маст. фільм.**
**9.40, 17.20, 22.15** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**10.05 «Палеская легенда». Маст. фільм.**
**11.20** «Легенды кіно». Гісторыя стварэння фільма «Палеская легенда».
**11.40 «Вясёлка». Маст. фільм.**
**13.05, 23.45** «Святло далёкай зоркі». Памяці жывапісца Ізраіля Басава.
**13.45** «Джаз-панарама». Канцэрт.
**14.35** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**15.05** «Жарабя». Кароткаметражны фільм.
**15.45** «Рана ў сэрцы. Міхал Клеафас Агінскі». Дак. фільм.
**16.30** «Эпоха». Луіс Маер.
**17.50 «Лёгкае жыццё». Маст. фільм.**
**19.40, 21.10, 22.40 «Авадзень». Маст. фільм. 1-я — 3-я серыі.**
**20.45** Калыханка.

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**8.55** Час футбола.
**9.40** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Рыга) — «Дынама» (Мінск).
**11.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Астан Віла» — «Манчэстэр Сіці».
**13.25** Спорт-кадр.
**13.55, 21.30** Спартыўная гімнастыка. Чэмпіянат свету.
**17.35** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Гомель» — «Юнацтва» (Мінск).
**19.25** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Ла Рыёха» (Іспанія) — «БГК ім. Мяшкова» (Беларусь).
**21.00** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фаззнда».
**11.55** «Мужчынскае/Жаночае».
**13.10** «Модны прыгавор».
**14.15** «Сам-насам з усімі».
**15.15, 16.15** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Зайцаў+1».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Дом з ліліямі».**
**23.15 Маст. фільм «Прэстыж».**
**1.35** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00, 13.50, 20.15** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Віцебская вобласць.
**9.05** «Спартыўны тыдзень».
**9.35** «Далёкія сваякі».
**10.00** «Цэнтральны рэгіён».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.35** «Не хлусі мне!».
**13.55** «Гарады, якія спяваюць». Кастынг-шоу. Брэсцкая вобласць.
**15.35** «Татальная распрадажа».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Вялікія тайны»: «Анёлы-ахоўнікі».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.20 Маст. фільм «Адна жанчына або дзве».**
**22.15** «Глядзець усім!».
**23.00** «Разумней не прыдумаеш. Зорны сезон».
**0.00** «Аўтапанарама».
**0.20 Серыял «Водбліскі».**

### МІР

**5.00** «180 хвілін».
**7.45** «Агульны інтарэс».
**8.10, 0.05 Маст. фільм «Арыфметыка кахання».**
**9.30 Маст. фільм «Заза».**
**11.10** Дак. серыял «У свеце прыгажосці».
**12.00, 15.00, 18.00, 23.30** Навіны (бягучы радок).
**12.15 Серыял «Суд».**
**14.05 Серыял «Тайныя знакі».**
**15.15, 22.40** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.05 Серыял «Таксістка-2».**
**18.20, 2.30 Серыял «Скліфасоўскі».**
**21.00 Маст. фільм «Ванечка».**
**23.40** «Агульны інтарэс».
**1.35 Серыял «Спальны раён».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.55** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.35** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.40** «Нябесны шчыт».
**16.40** «Факты».
**17.40 Серыял «Сэрца зоркі».**
**18.40 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.50** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».
**21.45 Серыял «Водар шыпшыны».**
**23.45** «Блізняты. Цуд у квадраце».
**0.35** «Хто першы? Хронікі навуковага плагіяту».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.05** «Да суда».
**9.05, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.30, 17.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**11.55, 13.20** «Суд прысяжных».
**14.30** «Пракурорская праверка».
**15.30** «Справа густу».
**16.35 Дэтэктыў «Іржа».**
**18.00** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**20.05 Серыял «Карпаў. Сезон трэці».**
**22.00** Анатомія дня.
**23.00 Серыял «Братаны».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.20, 19.05, 21.00, 23.30** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** Мультпарад.
**7.30 Серыял «Тыран».**
**9.15, 15.20** «Тэлемагазін».
**9.35, 17.55 Серыял «Крызіс».**
**10.20** «Кінаблакнот».
**10.35 Драма «Солт».**
**12.25** Дак. серыял «Рачныя монстры».
**13.15 Серыял «Кузей Гюней».**
**16.30** «Золата маўчання».
**16.55 Серыял «Чатыры тысячы чатырыста».**
**17.45** «Навіны».
**18.45** «Тваё здароўе». «Някаснае харчаванне».
**19.10 Серыял «Падзея».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Камедыя «Таксі».**
**23.00 Серыял «Блудлівая Каліфорнія».**

### ВТБ

**6.00, 4.30** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.00, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 13.00, 19.30 Серыял «Кухня».**
**9.30, 13.30, 19.00 Серыял «Аднойчы ў міліцыі».**
**10.00, 20.00 Серыял «Вароніны».**
**11.00, 3.30** Дак. фільм «Гульні лёсу».
**12.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**12.30, 23.05** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.00, 2.30 Серыял «Метад Лаўровай».**
**15.00, 1.45 Серыял «90210: новае пакаленне».**
**16.00 Фантастыка «Прадвеснікі буры».**
**18.30, 0.30** «Лаві момант».
**21.10 Меладрама «Жаніх напракат».**
**1.00 Серыял «Зачараваныя».**

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.40** Навіны культуры.
**9.15, 0.55** «Наглядальнік».
**10.15 Серыял «Расследаванні камісара Мегрэ».**
**11.05, 19.10** «Правілы жыцця».
**11.35** «Эрмітаж-250».
**12.05** Дак. фільм «Катастрофы мінулага. Цёмныя часы».
**12.50 Маст. фільм «Нікола Паганіні». 1-я серыя.**
**14.10** Academia.
**14.55** «Кінескоп». 62-ы Міжнародны кінафестываль у Сан-Себасцьяне.
**15.35** Дак. фільм «Грамадзяне! Не забывайцеся, калі ласка! Дзмітрый Прыгаў».
**16.15** Валерый Гергіеў і Лонданскі сімфанічны аркестр. І. Брамс. Сімфонія №4.
**17.00** «Сусветныя скарбы культуры».
**17.15** Дак. серыял «Гісторыя кінаначальнікаў, або Будаўнікі і перабудоўшчыкі. 70-я гады».
**18.15** Галоўная роля.
**18.30** Штучны адбор.
**19.40** «Добрай ночы, малыя!».
**19.50** Дак. фільм «Калі б не Коля Шатроў».
**20.35** «Гульня ў бісер».
**21.15** Дак. фільм «Катастрофы мінулага. Гнеў Божы».
**22.00** Дак. фільм «Антуан Лаўран Лавуазье».
**22.10** Дак. серыял «Адлюстраваны час».
**23.00 Маст. фільм «Францыя, 1788 1/2». 1-я і 2-я серыі.**
**0.35** Р. Штраус. Сімфанічная паэма «Дон Жуан».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00, 23.00** «Песня-78».
**6.05, 23.55** «Што? Дзе? Калі?». Паўфіналы. 1982 год.
**7.15** Канцэрт «Рэхам нашага юнацтва была».
**8.45 Маст. фільм «Лімонны торт».**
**9.05** «Мой тэатр». Е. Камбурава. 1989 год.
**10.10, 4.10** «Вакол смеху». 1978 год.
**11.00** «...Да 16 і старэйшым». 1989 год.
**11.50** Канцэрт «Белыя ночы».
**12.35 Маст. фільм «Тры непагодныя дні».**
**14.00, 20.00** «Мінулы час».
**15.00, 21.00** «Народжаны ў СССР».
**16.00, 22.00** «Да 70-годдзя Нэльсана Мандэлы». Канцэрт на стадыёне «Уэмблі». 1988 год.
**17.00** «Яловая субмарына»: «Гісторыя рускага рока». 2005 год.
**18.05** «Канцэрт савецкай песні». 1970 год.
**18.40 Маст. фільм «Быў сапраўдным трубачом».**
**1.00** «Будзільнік». «Дзень настаўніка». 1986 год.
**1.35** «Аўтарскі вечар Л. Ашаніна». 1982 год.
**3.00** Музычны фільм «Пра ката...».

### EUROSPORT

**9.30, 12.45** Веласпорт. Тур Ламбардыі.
**11.00** WATTS.
**12.00** Футбол. Еўрагалы.
**13.30, 2.05** Тэніс. Турнір WTA.
**22.45** Бокс. Чэмпіянат свету ВВО. D. Rosas (Мексіка) — A. Hernandez (Мексіка).
**23.55, 1.00** Аўта- і матаспорт.
**0.30** Чэмпіянат свету ў класе Турынг.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 0.15** Серыял «Нумар адзін спадар Кхан».
**6.00** Камедыя «Вайна гузікаў».
**7.45** Камедыя «Мільён на Каляды».
**9.20, 13.50, 16.45** Серыял «Татка».
**10.15** Камедыя «Зоймемся любоўю».
**12.15** Камедыя «Гэта здарылася на лесвіцы».
**14.50** Камедыя «Сінг-Сінг».
**17.40** Камедыя «Сюрпрыз».
**19.20** Камедыя «Няўдачнік Альфрэд, або Пасля дажджу... дрэннае надвор'е».
**21.00** Серыял «Вялікая школа». 1-я серыя.
**22.10** Камедыя «Дзейнічай, сястра!».
**23.50, 0.45** Скетчком «Паміж намі».
**1.00** Прафілактычны час на канале.

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.55, 14.30** «Доктар І...».
**8.25, 18.50, 2.05** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**10.00, 4.25** Дак. серыял «Па справах нязнойгадовых».
**11.45, 17.55** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.40, 16.55** «Шчырая гутарка».
**13.35, 20.40** Серыял «Тут хтосьці ёсць».
**15.00, 0.35** Серыял «Тайны следства».
**16.00, 22.40, 3.35** «Зорныя гісторыі».
**21.40, 1.20** Серыял «Кедр» пранізвае неба».
**23.35** Серыял «Быць чалавекам».

### ТБ1000

**5.00** Камедыя «Ходзяць чуткі...».
**7.00, 15.20** Меладрама «Нешта новенькае».
**9.00** Драма «Сёстры Магдаліны».



**11.10** Камедыя «Каханне: Інструкцыя па прымяненні».
**13.30** Жахі «Жанчына ў чорным».
**17.10** Камедыя «Настаўнік англійскай».
**19.00** Жахі «Экстрасэнс».
**21.00** Трылер «Тормаз».
**22.40** Драма «Баец».
**0.40** Камедыя «Віхор».
**2.30** Меладрама «Дракула».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**5.20** Дэтэктыў «Двайная пастка».
**7.40** Жахі «Масакра».
**9.30** Драма «Княжаўна Мэры».
**11.30** Камедыя «Іван Броўкін на цаліне».
**13.20** Фэнтэзі «Рыжык у Залюстаркоўі».
**15.30** Драма «Апошняя рэпрадукцыя».
**19.20** Трылер «Стальны матылёк».
**21.10** Дэтэктыў «Пярэвараценъ у пагонах».
**22.40** Драма «Адмірал».
**0.50** Драма «Мелодыя для катрынкі».
**3.25** Фэнтэзі «Рэальная казка».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Інжынерныя ідэі.
**6.00, 12.00, 20.00, 0.00, 3.00** Гульні розуму.
**6.30, 12.30, 21.00 1.00, 4.00** Гульня ў лічбы.
**7.00** Зрабі або памры.
**7.30, 22.00** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00, 13.00** Апакаліпсіс: Першая сусветная вайна.
**9.00, 14.00** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**10.00** Аўта-SOS.
**11.00** Золата Юкана.
**15.00** Каралева гіен.
**16.00** Дзікая прырода Амерыкі.
**17.00, 2.00** Паветраныя асы вайны.
**18.00** Машыны: разабраць і прадаць.
**19.00** Паядынак непераможных.
**23.00** Граніца.

### DISCOVERY

**7.00, 9.35** Залатая ліхаманка.
**7.50, 21.00** Хуткія і гучныя.
**8.40, 13.15, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 13.40, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**10.30, 5.10** Горад навыварат.
**11.25, 16.25** Паляўнічыя на рэліквіі.
**12.20, 0.55** Top Gear.
**14.10, 3.55** Паляўнічыя на аўтамабілі.
**15.05, 22.00, 6.05** Махінатары.
**16.00** Пятая перадача.
**17.20** Траса Калыма.
**18.15** Выжыванне без купюр.
**19.10** Выжыць разам.
**23.00** Вулічныя гонкі.
**0.00, 3.05** Склады: бітва ў Канадзе.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

## Тэлесеткі

# Каб усе так GEELY

**Новы тэлевізійны праект Агенцтва тэленавін, які запрашае замежных гасцей здзейсніць падарожжа па Беларусі, а суайчыннікаў — пачуць з першых вуснаў, якія ўражанні выклікае ў турыстаў наша краіна, стартуе на канале «Беларусь 1».**



Здымачная група АТН разам з замежнікамі з 8 краін свету пабывае ў розных кутках Беларусі. «Прычым гэта будзе не традыцыйны «турыстычны набор» з Мірскага замка, Нясвіжа, Белавежскай пушчы, а Беларусь самабытная, сучасная, прычым у нейкіх эпізодах нават экстрэмальная, якую мы ўбачым і з зямлі, і з-пад вады, і з вышыні птушынага палёту», — інтрыгуюць стваральнікі праекта. Напрыклад, у першым выпуску, які выйдзе ў эфір ужо 5 кастрычніка, вядучыя «Каб усе так Geely!» Якаў Бута і Дыяна Равякава пазнаёмяцца з 32-гадовым IT-спецыялістам з Германіі Ханесам Фарлокам і разам адправяцца ў падарожжа ў Ваўкавыск. Пры гэтым Дыяна выступае ў ролі гіда для замежніка, а Якаў арганізуе нечаканыя іспыты для госця праграмы. Па дарозе ў пункт прызначэння іх чакаюць некалькі прыпынкаў у малавядомых, але цікавых для турыста месцах.

Напрыканцы вядучыя пастараюцца здзівіць замежніка — ці ўласна мясцінамі, ці адметнымі падзеямі, архітэктурай, нацыянальнай кухняй, рыбалкай і г.д. Госць жа па 5-бальнай сістэме ацэніць месцы, дзе пабываў, і падзеліцца сваімі ўражаннямі ад паездкі.

**Калі:** 5 кастрычніка, 14.15.
**Дзе:** «Беларусь 1».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

## Май на ўвазе

# Працягласць адносін залежыць ад месца знаёмства

**Сацыяльныя сеткі, сайты знаёмстваў і спецыяльныя рэсурсы істотна змянілі тое, як многія людзі знаёмяцца, сустракаюцца, развіваюць адносіны і нават жэняцца.**



У новым даследаванні навукоўцы параўналі анлайн- і афлайн-сустрэчы. Яны таксама паспрабавалі высветліць, ці ўплывае тое, дзе пара пазнаёмілася, на развіццё іх адносін у далейшым, паведамляе Psych Central. Даследчыкі выявілі, што пары, якія пазнаёміліся ў інтэрнэце, распадаюцца часцей у параўнанні з парамі, якія сустрэліся ў рэальным жыцці. Гэта тычылася як рамантычных адносін, так і шлюбаў. Навукоўцы адзначаюць: безумоўна, разрыву могуць садзейнічаць і іншыя фактары — напрыклад, якасць адносін і іх працягласць. Гэтыя фактары могуць адрозніввацца для пар, якія знаходзяцца і не знаходзяцца ў шлюбе.

## СУБОТА, 11 КАСТРЫЧНІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.05** Існасць.
**7.30 Меладрама «Дзе знаходзіцца «нофелет»?».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.45, 23.35 Серыял «Сваты 6».**
**10.55** «Пра ежу!».
**11.25** Кулінарная дыпламатыя.
**12.10** Дача.
**12.50** Ток-шоу «Здароўе».
**13.30** БеларусьLIFE.
**13.55** «Зорнае жыццё». «Жыццё пасля самагубства».
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Беларусь у развіцці».
**16.05, 0.55** «Вялікая розніца».
**17.10 Трылер «Цёмныя лабірынты мінулага». 1-я — 4-я серыі.**
**21.00** Панарама.
**21.40 Камедыя «Бедная LIZ».**
**0.45** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.05 Маст. фільм «Казка пра закаханага маляра».**
**8.30** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**9.20** Беларуская кухня.
**10.05, 21.05** Тэлебарометр.
**10.10** Капейка ў капейку.
**10.45, 21.25 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**
**12.00** «Бітва экстрасэнсаў».
**13.35** Вось гэта дзіва!
**14.10 Дэтэктыў «Марыя Верн: Зніклы хлопчык».**
**15.55 Камедыя «Мільянер паняволі».**
**17.55** «Comedy woman».
**19.15** Ваша лато.
**19.55** Латарэя «Пяцёрачка».
**20.05** Ікра.
**20.40** Кіпень.
**21.00** КЕНО.
**21.10** «На прыродзе».
**22.40 Драма «У даліне Эла».**
**0.50** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 12.20, 14.20, 0.05** «Калейдаскоп».
**8.15 «Тая, што бяжыць па хвалях». Маст. фільм.**
**9.40** «Камертон». Народны артыст Расіі Дзмітрый Хварастоўскі.
**10.15** «Легенды кіно». Гісторыя стварэння фільма «Хрыстос прызямліўся ў Гародні».
**10.25 «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». Маст. фільм.**
**11.50** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.35** «Сямейны альбом». Барыс Луцэнка.
**12.45 «Смяротная памылка». Маст. фільм.**
**14.35** Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. Частка 2-я.
**15.05** «Незабыўны вечар бельканта». Канцэрт Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь.
**15.55** «Дыя@блог P.S.».
**16.30 «Цудоўныя панове з Буа Дарэ». Маст. фільм. 3-я — 5-я серыі (закл.).**
**20.45** Калыханка.
**21.10 «У люстэрка два твары». Маст. фільм.**
**23.10** «Розныя лёсы Тацяны Пілецкай». Дак. фільм.
**23.40** «Вечар цяжкага дня». Пісьменнік Аляксандр Праханаў.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.55, 17.45** Спартыўная гімнастыка. Чэмпіянат свету.
**11.45** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Слован» (Браціслава).
**13.40** Рэаліці-шоу «Mix Fight. Новыя гарызонты» — Мінск.
**14.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**15.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**15.55** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Хімкі» (Маскоўская вобл.).
**21.40** Баскетбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
**23.20** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** «Смяшарыкі». Новыя прыгоды.
**9.20** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Ідэальны рамонт».
**12.05** «Разумніцы і разумнікі».
**12.50 Маст. фільм «Тайны Мунакра».**
**15.00** Да 80-годдзя акцёра. «Савелій Крамараў. Джэнтльмен удачы».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Вялікія гонкі».
**17.45** «100 мільёнаў».
**18.40 Маст. фільм «Каханне з пераследам».**
**21.05** «Хачу да Меладзэ».
**23.05** «Што? Дзе? Калі? у Беларусі».
**0.35 Маст. фільм «Троя».**

### СТБ

**6.00 Серыял «Фірмовая гісторыя».**
**7.30** «Анфас».
**7.45 Камедыя «Осцін Паўэрс: Шпіён, які мяне спакусіў».**
**9.30, 13.40** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Віцебская вобласць.
**9.35** «Чыстая работа».
**10.25** «Далёкія сваякі».
**10.55** «Гэта мой дом».
**11.30** «Мінск і мінчане».
**12.05** «Прыгоды дылетанта».
**12.40** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**13.45 Маст. фільм «Жорсткі раманс». 1-я серыя.**
**15.15** «Ваенная тайна».
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** «Дзіўная справа».
**18.35** «Разумней не прыдумаеш. Зорны сезон».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Гарады, якія спяваюць». Кастынг-шоу. Віцебская вобласць.
**22.00** «Зорны рынг. Бітва хітоў». Гурт «Шэрлак Холмс» супраць групы «КантраБанда».
**23.05 Маст. фільм «Магнолія».**

### МІР

**5.00 Маст. фільм «Пакуль гром не грымне».**
**7.10** «Саюзнікі».
**7.35** М/ф.
**8.15** «Эксперыментатары».
**8.30** «Нітка да ніткі».
**9.00, 15.00** Навіны (бягучы радок).
**9.15** «Любімыя акцёры».
**9.40 Маст. фільм «Гараж».**
**11.30, 0.25 Серыял «Лабірынты хлусні».**
**15.15 Серыял «Зоя».**
**22.45 Маст. фільм «Калі ты мяне чуеш».**
**3.40 Маст. фільм «Трактарысты».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Маст. фільм «Дом будуецца».**
**8.15 Маст. фільм «З чыстага ліста».**
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** «Планета сабак».
**12.20 Серыял «Мора па калена».**
**14.15** «Шлях дадому».
**14.50** «Танкавы біятлон».
**16.00** «Крывое люстэрка».
**17.40** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Дак. фільм Аркадзя Мамантава «Рэйс МН17. Перапынены палёт».
**21.55 Маст. фільм «Сіла кахання».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.25** Серыял «Дарожны патруль».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Урачэбныя тайны плюс».
**8.55** «Агляд».
**9.25** «Справа густу».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.25** Ток-шоу «ДНК».
**14.25** «Я худзею».
**15.25** «Паедзем, паядзім!».
**16.20** «Кантрольны званок».
**17.15** «Ворагі народа».
**18.00** «Следства вялі...».
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.05** «Новыя рускія сенсацыі».
**21.10 Маст. фільм «Бацькоўскі дзень».**
**23.00** «Жыццё як песня. Тату».
**0.10** «Мужчынская годнасць».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.20, 19.05, 21.05, 23.50** «Надвор'е».
**9.05** Мультпарад.
**9.30 Серыял «Страла».**
**11.00** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.10 Прыгоды «Мумія вяртаецца».**
**13.25 Баявік «Драпежнік».**
**15.20** «Кінаблакнот».
**15.30** «Тэлемагазін».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Камедыя «Мініно».**
**18.15 Серыял «Чатыры тысячы чатырыста».**
**19.10 Трылер «Гарадскія легенды-3».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Драма «Капітан».**

### ВТБ

**6.00, 4.00** «PLAY».
**8.30** М/ф «Смяшарыкі».
**9.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**10.00, 2.00** «Міксер».
**12.00** «Сябры па кухні».
**12.30 Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».**
**15.00 Меладрама «Невыносная жорсткасць».**
**17.15, 20.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**17.30** «Уральскія пельмені».
**19.00 Серыял «Васьмідзясятыя».**
**20.30 Камедыя «Сэрцаедкі».**
**23.15** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**23.30** «Ленінградскі Stand-up клуб».
**0.30** «Лаві момант».
**1.00** «Нерэальная гісторыя».
**1.30** «Людзі Хэ».

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00** Біблейскі сюжэт.
**9.35 Маст. фільм «Сябар мой, Колька!..».**
**11.00** «110 гадоў з дня нараджэння Аляксея Каплера. «Мой сярэбраны шар». Сяргей Снежкін.
**11.45** Вялікая сям'я. Сяргей Снежкін.
**12.40, 0.55** Дак. серыял «Афрыка».
**13.30** Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны. Дак. серыял «Нефрантавыя нататкі».
**14.00** Да 105-годдзя з дня нараджэння Бруна Фрэйндліха. Спектакль Ленінградскага акадэмічнага тэатра драмы імя А.С. Пушкіна «Казкі старога Арбата».
**16.40** Дак. фільм «Марскія цыганы М'янмы».
**17.35 Маст. фільм «Светлы шлях».**
**19.10** Да 80-годдзя з дня нараджэння Савелія Крамарава. Дак. фільм «Невядомы бенефіс».
**20.00** «Вялікая опера».
**22.05** «Белая студыя». Станіслаў Гаварухін.
**22.45 Кіно на ўсе часы. Маст. фільм «Маска».**
**0.45** М/ф для дарослых «Ліфт».
**1.45** Дак. фільм «Алена Блавацкая».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.05** Дак. фільм «Прамысловы шпіянаж».
**5.35** М/ф «Першыя сустрэчы».
**5.50** Канцэрт народнага артыста СССР Мусліма Магамаева. 1985 год.
**6.40, 0.40 Маст. фільм «Вялікі бурштын».**
**8.00, 14.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.00** «Тэма». 1992 год.
**10.45** Канцэрт «Удваіх з аркестрам».
**11.00** «Міжнародная панарама». 1978 год.
**11.35** Фільм-канцэрт «Аншлаг».
**12.20 Тэлефільм «Следства вядуць ЗнаТаКі».**
**13.10** «Ранішняя пошта». 1988 год.
**13.40** Канцэрт замежнай эстрады.
**15.00** «Колба часу».
**16.00** «Кінапанарама». Фрагменты выпускаў. 1977 год.
**16.45** Фільм-канцэрт «Вальс аб вальсе».
**17.00** «Пад знакам задыяка. Шалі». 1991 год.
**18.50** «Гэта было, было...». Песні А. Астроўскага. 1989 год.
**19.20 Маст. фільм «Заваёўнікі гор».**
**19.45** Фільм-канцэрт «Мелодыі і рытмы замежнай эстрады».
**21.00** Фільм-спектакль «Лёс гуляе чалавекам».
**22.25** Спявае ансамбль «Добры дзень, песня!». 1979 год.
**23.00** Дак. фільм «Сустрэчы ва Урангоі».
**23.40** Фільм-канцэрт «Радасць — гэта песня».
**4.00** «Во, жыццё давяло!». 1994 год.

### EUROSPORT

**8.30, 12.00** Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**9.30** Веласпорт. Тур Пекіна.
**13.00, 2.00** Тэніс. Турнір WTA.
**18.30, 0.30** Дартс.
**20.30** Байцоўскі клуб.
**22.30** Баявыя майстэрствы.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 9.00, 13.30** Серыял «Вялікая школа».
**6.00** Камедыя «Няўдачнік Альфрэд, або Пасля дажджу... дрэннае надвор'е».
**7.30** Камедыя «Зануда».
**10.00** Камедыя «Пацучыныя скачкі».
**11.50** Мюзікл «Двайныя непрыемнасці».
**14.30** Камедыя «Пакуль ты спаў».
**16.10, 21.50, 23.55** Скетчком «Паміж намі».
**16.30, 21.00** Серыял «Пэт і Кэбедж».
**17.20** Камедыя «Трое мужчын і немаўля».
**19.20** Камедыя «Трое мужчын і маленькая лэдзі».
**22.10** Камедыя «Мой лепшы палюбоўнік».
**0.15** Камедыя «Дзейнічай, сястра 2. Старыя звычкі».
**2.10** Серыял «Татка».
**3.10** Камедыя «Дзейнічай, сястра!».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.10, 5.10** «Дом дагары нагамі».
**11.10** «Хронікі маскоўскага побыту».
**12.00** «Гісторыі выратавання».
**12.35, 1.45** Дак. фільм «Пра што маўчала Ванга».
**13.20, 2.25** Маст. фільм «Агарова, 6».
**15.00** Дак. фільм «Аляксандр Буйноў. Мужчына на сцэне і ў жыцці».
**16.30, 1.00** «Свая праўда».
**17.30, 3.50** Дак. фільм «Знайсці згубленага».
**19.00** «Даўно не бачыліся!».
**20.20** Маст. фільм «Першы пасля Бога».
**22.20** Маст. фільм «Каламбіяна».
**0.15** Серыял «Белы каўнерык».

### ТБ1000

**5.00** Драма «Олівер Твіст».
**7.40** Камедыя «Пастка для нявесты».
**9.25, 2.55** Трагікамедыя «Пажыццёва».
**11.30** Дэтэктыў «Дванаццаць сяброў Оўшэна».
**13.50** М/ф «Гномеа і Джульета».
**15.30** Камедыя «СМСуальнасць».
**17.05** Драма «Маладая Вікторыя».
**19.00** Драма «Марыя-Антуанета».
**21.10** Драма «Вялікія надзеі».
**23.30** Меладрама «Бяспека не гарантуецца».
**1.05** Трылер «Тормаз».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**5.20** Камедыя «Двайная прапажа».
**7.20** Камедыя «Вось гэта каханне!».
**9.00** Жахі «Масакра».
**10.50** Драма «Водпуск у верасні».
**13.25** Драма «Туман».
**16.05** Драма «Туман 2».
**19.20** Фантастыка «Цёмны свет: Раўнавага».
**21.05** Трылер «Стальны матылёк».
**23.00** Трагікамедыя «Белы маўр, або Інтымныя гісторыі пра маіх суседзяў».
**0.50** Фэнтэзі «Востраў загінулых караблёў».
**3.30** Камедыя «Іван Броўкін на цаліне».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Інжынерныя ідэі.
**6.00** Цяжкае золата Аляскі.
**7.00, 16.00** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00** Займальная навука.
**9.00** Космас: Прастора і час.
**10.00** Гульня ў лічбы.
**11.00, 22.00, 2.00** Рэальнае паранармальнае.
**12.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**13.00** Апакаліпсіс: Першая сусветная вайна.
**14.00** Народжаны поўзаць — лятаць можа!
**15.00** Небяспечныя сустрэчы.
**20.00, 0.00, 3.00** Сутыкненне з астэроідам.
**21.00, 1.00, 4.00** Камета стагоддзя.
**23.00** Праўда пра зомбі.

### DISCOVERY

**7.00** Як гэта ўстроена?
**7.25, 14.35** Хуткія і гучныя.
**8.15** Выжыць разам.
**9.10, 2.40** Траса Калыма.
**10.05** Смяротны ўлоў.
**11.00, 6.05** Багажныя войны.
**11.50, 21.00** Склады: бітва ў Канадзе.
**12.45, 5.10** Гаражнае золата.
**13.40** Махінатары.
**15.30** Вулічныя гонкі.
**16.25** У пагоні за класікай.
**22.00** Тыкль.
**23.00** Глядзі ў абодва.
**0.00** Скрозь кратовую нару.
**0.55** Паўстанне машын.
**1.50** Сібірская рулетка.
**3.30** Героі сярод нас.
**4.20** Маланкавыя катастрофы.
**4.45** Як гэта зроблена?

## Гэта цікава

# ЯК ЗМЯНІЛІСЯ ЛЮДЗІ ЗА АПОШНІЯ 100 ГАДОЎ

**Павелічэнне росту чалавека.** Апошняе даследаванне паказала, што ў развітых краінах людзі сталі вышэй, а самы высокі сярэдні рост у свеце — 1,85 см — назіраецца ў Нідэрландах. Хоць амерыканцы былі самымі высокімі людзьмі ў свеце ў перыяд Другой сусветнай вайны (1,77 см), да канца XX стагоддзя тэмпы змянення паказчыкаў росту запаволіліся. У некаторых краінах, дзе часта назіраліся эпідэміі хвароб, войны і іншыя праблемы, сярэдні рост час ад часу зніжаўся. Даследчыкі лічаць, што негатыўныя фактары (такія, як голад або эпідэміі) робяць уплыў на наступныя пакаленні і пратабуецца каля 5 пакаленняў, каб пераадолець іх.

**Людзі становяцца таўсцейшымі.** Так, у 2013 годзе 29% сусветнага насельніцтва пакутавала на лішнюю вагу або атлусценне. Некаторыя даследчыкі лічаць, што ўсяму віной пераяданне і адсутнасць фізічнай актыўнасці. Але існуе таксама тэорыя, што тут адыгрывае ролю генетыка. Звязваюць з атлусценнем і пэўныя вірусы. Насуперак распаўсюджанаму меркаванню, многія даследаванні знайшлі сувязь паміж лішняй вагой і беднасцю. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што такая тэндэнцыя звязана з эпігенетыкай або спадчыннымі зменамі, якія ўплываюць на тое, як цела захоўвае лішак энергіі з ежы. Напрыклад, калі маці і бабуля перанеслі цяжкія часы, гэта перадаецца наступным пакаленням, і, калі наступаюць добрыя часы, цела спрабуе захаваць дадатковую энергію ў выглядзе тлушчу.

**Ранняе палавое высіпяванне.** У многіх краінах дзеці дасягаюць спеласці раней, асабліва дзяўчынкі. Шматлікія даследаванні паказалі, што за апошнія 50 гадоў узрост, калі дзяўчынкі дасягаюць палавой спеласці, знізіўся. Даследаванне, праведзенае ў ЗША, паказала, што ўзрост менархе знізіўся на 0,3 года за дзесяцігоддзе з сярэдзіны 1800-х гадоў, калі першая менструацыя ўзнікала ў 17 гадоў, да 1960-х гадоў. Акрамя таго, існуе сувязь паміж празмернай паўнатой і раннім надыходам палавой спеласці, і дзяўчынкі з высокім індэксам масы цела дасягаюць яе ў больш раннім узросце. Гэта можа мець негатыўныя наступствы для здароўя, бо навукоўцы высветлілі, што ранняе высіпяванне звязана з развіццём гіпертаніі і дыябету ў больш познім узросце.

**Даўгалецце чалавека і яго негатыўныя наступствы.** Людзі цяпер жывуць даўжэй, чым калі-небудзь. Паводле звестак СААЗ, сярэдняя працягласць жыцця ва ўсім свеце вырасла з 30 гадоў у пачатку XX стагоддзя да 70 гадоў у 2012 годзе. Спецыялісты прадказваюць, што сярэдняя працягласць жыцця жанчын, народжаных у 2030 годзе, вырасце да 85 гадоў. Аднак павялічылася смяротнасць ад дэгенератыўных захворванняў — такіх, як хвароба Альцгеймера, захворванняў сэрца, рак. Іншымі словамі, людзі сталі жыць даўжэй, але паміраюць ад іншых хвароб, чым у мінулым. Рост аўтаімунных захворванняў — такіх, як рассеяны склероз і цукровы дыябет 1-га тыпу — некаторыя навукоўцы звязваюць з паляпшэннем гігіены. Гэта значыць, калі цела падвяргаецца ўздзеянню занадта малой колькасці мікробаў, імунная сістэма занадта востра рэагуе нават на самых бяскрыўдных мікробаў.

Што ж чакае людзей у будучыні, калі ўлічваць, як хутка змяняюць наш свет тэхналогіі? Існуюць пэўныя апасенні, што будучыня эвалюцыі будзе вызначацца генетычнай інжынерыяй. Біянічныя імплантаты, нанатэхналогіі і новыя лекі могуць яшчэ больш падоўжыць жыццё чалавека. Некаторыя навукоўцы лічаць, што мы можам дасягнуць неўміручасці з дапамогай тэхналогій у бліжэйшыя 30 гадоў. ■

# І «СТЫЛЁВЫЯ» ДЗЕТКІ ЧЫТАЮЦЬ «ВЯСЁЛКУ»!..

**Наш сённяшні суразмоўца на тэму дзіцячай медыйнай прасторы — вядомы дзіцячы пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Уладзімір ЛІПСКІ. Два часопісы зараз выходзяць пад яго кіраўніцтвам — «Вясёлка» і «Буся». Што характэрна, адным з іх ён кіруе ўжо больш за тры дзесяцігоддзі.**


Фота Наталлі АСМОЛЫ.

***— Уладзімір Сцяпанавіч, «Вясёлка» — гэта...***

— Гэта — вясёлка ва ўсіх сваіх колерах, у шматабсяжных уплывах на юных чытачоў — дашкольнікаў і малодшых школьнікаў, часопіс, з якім і ў чытанні, і ў выхаванні можна смела рабіць першыя крокі. А значыць — варта чытаць яго не толькі дзецям, але і дарослым.

***— Але ж вы не педагагічнае выданне, якое можна параіць маладым бацькам...***

— І педагагічнае, калі бацькі жадаюць выхоўваць дзіця ў любові да роднага, айчыннага, у любові да сваёй дзяржавы, калі таты і мамы дбаюць пра засваенне дзецьмі роднага слова. Паглядзіце, як днямі выразна сказаў Прэзідэнт пра патрэбу пашырэння вывучэння беларускай мовы. Дык вазьміце ў рукі «Вясёлку» — і разам з дзецьмі раз на тыдзень ці раз на месяц пагартайце часопіс з мэтай засваення родных слоў, родных мастацкіх вобразаў. Мы друкуем лепшае, што нараджаецца ў прасторы дзіцячай літаратуры...

***— Часопіс не вельмі вялікі памерам...***

— А ён і не павінен быць такім. Для рэалізацыі задач, падкрэслівання лепшага дастаткова трох улікова-выдавецкіх аркушаў. І паперу выбіраем высокай якасці. Каб у чытачоў не знікала ўражанне эстэтычнай асалоды.

***— У «Вясёлкі» невялікі рэдакцыйны склад. Але ведаю, што шмат сіл аддаяце арганізацыйнай рабоце...***

— «Вясёлкаўцы» стараюцца не мінаць ніводзін з раёнаў краіны. А як жа іначай? Трэба заўжды пісьменнікам, журналістам, якія працуюць з дзецьмі, бачыць непасрэдна сваю аўдыторыю. Толькі сёлета пабывалі ў дзясятках сельскіх раёнаў краіны!.. Конкурсы, спаборніцтвы, якія мы арганізоўваем, ведаюць у сотнях школ і сотнях дзіцячых садкоў: «Лепшы сябар «Вясёлкі», «Люблю Беларусь», «Самая дарагая рэч у тваёй сям'і», «Вясёлка» запрашае ў Цырк», «Жывая класіка», «Стылёвыя дзеткі», «Казачны горад разам з «Вясёлкай»... З года ў год «Вясёлка» ладзіць завочнае падарожжа па нашай краіне, знаёміць з вядомымі людзьмі розных прафесій. Дзецям — пра гэта ведаем з вялікай пошты рэдакцыі — падабаюцца рубрыкі «Наша спадчына», «Школа «Вясёлкі», «Хвіліны-весялінкі», «Спеўнік «Вясёлкі» і іншыя. Мы арганізоўваем экскурсіі па Мінску. Дзеці наведваюць музей «Вясёлкі», знаёмяцца з работай рэдакцыі часопіса. Гэта ўражліва, калі малеча прыходзіць у дарослую рэдакцыю, знаёміцца з пісьменнікамі, бачыць нашу журналісцкую лабараторыю. Тым самым мы развіваем у дзяцей творчы складнік мыслення, падаём новую для іх інфармацыю. Ну хіба ж мы не педагогі? Тут нам добра дапамагае памяць пра Васіля Вітку, які доўгі час працаваў у «Вясёлцы» і які, акрамя сваіх дзіцячых кніг, напісаў сапраўдныя мастацкія падручнікі па педагогіцы, завострана публіцыстычна выказаў свае погляды на выхаванне дзетак.

***— Калі не памыляюся, у вас ёсць і прэмія яго імя?***

— Так, штогод мы ўручаем імянную прэмію імя Васіля Віткі — імя заснавальніка і першага галоўнага рэдактара «Вясёлкі», лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, заслужанага дзеяча культуры рэспублікі. Штогод у маі на радзіме Васіля Віткі ў Слуцкім раёне адбываецца ўшанаванне нашых лаўрэатаў падчас «Тыдня Віткаўскіх чытанняў».

Адным з педагагічных, выхаваўчых клопатаў мы бачым сваю задачу па асвятленні ролі традыцый у аб'яднанні грамадства. Размова і пра народныя святы, звычаі, якія хлопчыкі і дзяўчынкі павінны ведаць з маленства. «Вясёлка» паказвае каляндарны цыкл жыцця беларусаў. Гэта праяўляецца ў публікацыі здымкаў дзяцей у традыцыйных касцюмах у музеі народнай архітэктуры і побыту пасёлка Азярцо, у расповедзе пра асноўныя сезонныя святы — Сёмуху, Юр'я, Вербніцу, Купалле і інш.

Народныя традыцыі, песні шырока выкарыстоўваюцца ў рэкламнай справе, бо яны ўвабралі мудрасць продкаў, ёмістыя і пазнавальныя, аб'ядноўваюць сваёй аўтэнтычнасцю, заўсёды арыгінальныя.

На працягу апошніх трох гадоў супрацоўнікі рэдакцыі часопіса «Вясёлка» рыхтуюць і выдаюць спецыяльны нумар для дзяцей беларусаў у Расіі і для сваіх чытачоў аб дружбе двух народаў, аб Саюзнай дзяржаве, якая выбудоўваецца для іх.

***— У апошні час «Вясёлка» актыўна занялася кнігавыдавецкай дзейнасцю. Наколькі гэтая справа ўкладваецца ў вашы медыйныя, інфармацыйныя задачы?***

— У нас друкуюцца аўтары розных пакаленняў — ад народных пісьменнікаў да тых, хто толькі пачынае свой творчы шлях. Не абыходзіць увагай рэдакцыя і таленавітых дзяцей: іх вершы, казкі, апавяданні, малюнкі аздабляюць і ўзбагачаюць часопіс. За гэты час «Вясёлка» стварыла цэлую бібліятэку — змястоўных, цікавых, з густам аформленых лепшымі мастакамі кніг. Рэдакцыя паспрыяла выхаду ў свет кніжак «Урокі цікавых сустрэч», «Нам засталася спадчына» — дапаможнікаў у правядзенні ўрокаў па вывучэнні спадчыны, гісторыі нашай Радзімы. Працягам выдавецкай дзейнасці часопіса стаў праект з выдавецтвам «Адукацыя і выхаванне» — «Бібліятэка часопіса «Вясёлка». Плёнам сумеснай працы сталі кнігі розных жанраў: «У свеце дабрыні» (выбраныя творы вядомай дзіцячай пісьменніцы Эдзі Агняцвет), «Сакрэты колераў «Вясёлкі» Уладзіміра Ліпскага, «Кот жыве без турбот» (укладальнік Анатоль Зэкаў), вершы літоўскага дзіцячага пісьменніка Вітаўтаса Бараўскаса «Зіхаціць на небе сонца», «Таямніцы дзеда Усёведа». Творы, якія ўключаны ў кнігі серыі, прайшлі сапраўднае выпрабаванне часам: усе яны былі надрукаваны ў часопісе «Вясёлка» ў розныя гады, але сустрэліся толькі на старонках пазначаных кніг. У бібліятэцы «Вясёлкі» плануецца выдаць сто кніг!

Супрацоўнікі нашага выдання заўсёды клапоцяцца аб тым, як зацікавіць дзяцей высокай, сапраўднай, класічнай літаратурай, што з'яўляецца крыніцай духоўнасці, маральнасці. З гэтай мэтай праводзім акцыю «Чытаем разам, чытаем па-беларуску!». І тут нашы кнігі як ніколі да месца.

А наш музей «Вясёлкі»... За двухгадовы перыяд працы на экскурсіі ў сваім любімым часопісе пабывалі 5000 вучняў пачатковых класаў са школ рэспублікі. На працягу 2013 года «Вясёлку» наведалі больш за 2,5 тыс. чалавек. Быў створаны філіял музея, які таксама гасцінна прымае вучняў Маскоўскага раёна Мінска ў дзіцячай бібліятэцы імя В. Віткі.

Каб сустрэчы і выступленні былі больш яскравымі і запамінальнымі, рэдакцыя распрацавала рэкламную прадукцыю, якая ўручаецца ў якасці прызоў і сувеніраў. Напрыклад, сертыфікаты на бясплатнае наведванне музея, падпісныя купоны, лістоўкі, закладкі з вокладкамі часопіса, дыпломы, падзякі, календары, «Вясёлікі» — вясёлкаўскія грошы, наклейкі, расклады, распрацаваныя спецыяльна для дзяцей беларускамоўныя карты Беларусі, стылізаваныя сцяжкі.

Гэта ўсё падабаецца нашаму юнаму чытачу і павышае цікавасць да часопіса.

***— І ўсё ж галоўнае ў працы і часопіса, і газеты — яго змест...***

— Галоўнае, каб з часопісам было ўтульна і юнаму, і даросламу чытачу. Для тых, хто яшчэ не гартаў «Вясёлку», скажу... Выданне складаецца з пазнавальных рубрык і прыгодніцкіх апавяданняў, з казак і вершаў. Часопіс вучыць любіць свой край, родную мову і гісторыю. Настаўнікі могуць выкарыстоўваць нашы матэрыялы пад рубрыкамі «Наша спадчына», «Школка «Вясёлкі», «Тэатр Васі Вясёлкіна», «Слоўнік «Вясёлкі», «Спеўнік «Вясёлкі», «Каласавічок», «Хвілінкі-весялінкі», «Зрабі сам». Супрацоўнік Нацыянальнага інстытута адукацыі Ірына Буторына падрыхтавала кнігу «Дапаможнік для выхавальнікаў і настаўнікаў па матэрыялах часопіса «Вясёлка», распрацаваны 50 самых розных пазнавальных урокаў.

***— А чым кіраваліся, дадаючы да сваіх «вясёлкаўскіх» абсягаў яшчэ і «Бусю»...***

— У 2013 годзе ў нас з'явілася новае выданне для самых маленькіх чытачоў — беларускамоўны часопіс «Чытанка-маляванка для дашкольнікаў «Буся». Нашы бусяняты чытаюць цікавыя казкі, апавяданні, загадкі, лічылкі, крыжаванкі, коміксы, якія дапамагаюць ім развівацца творча, гарманічна. Часопіс — добры памочнік у вывучэнні беларускай мовы, выхаванні і развіцці.

Ёсць надзея і вера, што наша калектыўная нянька стане запатрабаванай у дзіцячых садках і ў сем'ях, дзе ёсць малеча.

***— Сёння гавораць пра тое, што і зусім малыя дзеці сыходзяць у прастору айфонаў, айпэдаў і электронны інфармацыйны прадукт займае ўсю свядомасць... Ці не застаёмся мы з адно толькі друкаванай, папяровай перадачай інфармацыі ва ўчарашнім дні?***

— Сайт veselka.by з'явіўся ў сеціве ў 2011 годзе. Функцыянуе круглы год, уключае дадатковыя сэрвісы: апытанні, відэакантэнт, фотагалерэі, анекдоты, магчымасць каментаваць змешчаныя матэрыялы і тым самым камунікаваць з рэдакцыяй.

Усе матэрыялы сайта падзелены па рубрыках, каб госцю было лягчэй арыентавацца. Для лепшай пошукавай аптымізацыі рэсурс уключае ў сябе матэрыялы на рускай мове, тэматычныя тэгі і тэгі alt, прапісаныя па-лацінску пад кожным малюнкам да тэкстаў. Ідзе пастаянны пошук партнёраў і абмен банерамі і ссылкамі з іншымі інтэрнэт-рэсурсамі. Самыя папулярныя рубрыкі на сайце — «Вершы», «Апавяданні» і «Казкі». Мэтавая аўдыторыя праекта — школьнікі, а таксама бацькі, зацікаўленыя ў культурным развіцці сваіх дзяцей. Але аналіз паказаў, што 72% гасцей сайта — наведвальнікі ва ўзросце 24-35 гадоў (бацькі, і гэта добра!). Толькі 5% наведвальнікаў малодшыя за 18 гадоў.

Папулярызацыя сайта часопіса здзяйсняецца таксама ў сацыяльных сетках: «Youtube», «Twitter», «Одноклассники» і «ВКонтакте». Сёння гэта самая цікавая форма камунікацыі з аўдыторыяй. У сацыяльных сетках аператыўна і максімальна эфектыўна даносіцца да чытачоў інфармацыя пра новыя праекты рэдакцыі. У даверальнай форме, з выкарыстаннем методыкі «Роўны вучыць роўнага», фарміруюцца адпаведнае стаўленне падпісчыкаў да часопіса і яго супрацоўнікаў. Самыя прадуктыўныя сацыяльныя сеткі «Вясёлкі» — «Twitter» і «Вконтакте».

***— Вашай інтэрнэт-актыўнасці таксама можна пазайдросціць...***

— Галоўнае — змест, каб мысленне дзіцяці мела разумны характар. І ў друкаванай папяровай версіі, і ў электроннай патрэбны адны і тыя ж падыходы — яркія сімвалы і вобразы, сапраўдныя мастацкія і высакаякасныя публіцыстычныя творы. Тады можна будзе смела гаварыць пра выкананне галоўных задач дзіцячых масмедыя.

**Гутарыў Павел АЛЬСОВЫ.**

■ Неасабісты суб'ектыў



# РАДЗІМА ЯК АДЧУВАННЕ

## Каб быць на сваёй зямлі сапраўды сваім, трэба з ёй — як у шлюбнай клятве: «...у багацці і беднасці, у горы і радасці»

У Остэндзе, на суровым узбярэжжы бельгійскай Фландрыі, сустрэць рускамоўных адпачывальнікаў амаль нерэальна: паўночней сусветна вядомага Бруге турысты звычайна не заязджаюць. Мы і з гэтымі пазнаёміліся выпадкова: дзеці адно аднаго пачулі ў рознагалосым натоўпе. «Мама, гэтая дзяўчынка размаўляе па-руску!» — на ўвесь пляж захоплена крычала пяцігадовая Маша, цягнучы за руку смуглявую сарамлівую Еву. Хутка падышла і Евіна маці Людміла, і ўжо нават не трэба было пытацца, адкуль яна: славяне адно аднаго пазнаюць здалёк. А гэтую так і хацелася адразу назваць зайздросна-ласкава — «хахлушка», такая крамяная ў яе постаць, столькі жыццядайнай цеплыні ў вачах. Яна сапраўды нарадзілася і вырасла ва Украіне, але, расказваючы пра сваё жыццё, здаецца, нават і часцей, чым трэба было, падкрэслена вымаўляла: «Я — бельгійка». (Знаёмыя мясцовыя жыхары толькі паблажліва ўсміхаліся: у гэтай краіне ты альбо фламандзец, або валонец, або з правінцыі Брусель. «Бельгіец у нас толькі кароль», — жартуюць яны, і ў гэтым жарце амаль сто працэнтаў праўды. Зрэшты, эмігранты, для якіх гэта краіна стала другой Радзімай, да жартаў на такія сур'ёзныя тэмы не схільныя і гатовы падкрэсліваць свой патрыятызм у любой сітуацыі).

